ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**«Вучоны — гэта і маркетолаг, і менеджар, і рэкламшчык»**



**Прэстыж прафесіі настаўніка: разважанні маладых**

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 САКАВІКА 2014 г. ЧАЦВЕР № 56 (27666) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# КАБ У СВЕЦЕ БЫЛО СВЯТЛЕЙ



**Наталля Шабуневіч разам з сястрой Аксанай і яшчэ некалькімі майстрамі ўручную робяць дзясяткі прыгожых свечак. Іх маленькая фабрыка пад назвай «Свечачны завулак» знаходзіцца ў Бараўлянах. Тут на працягу амаль трох гадоў звычайны парафін ператвараюць у сапраўдныя маленькія шэдэўры.**

Спачатку ў спецыяльныя сіліконавыя формы заліваюць гарачы парафін, які награваюць да 60 градусаў. Пасля дадаецца харчовы фарбавальнік. Колеры — на любы густ: ружовы і сіні, фіялетавы і жоўты, чырвоны і зялёны... І, безумоўна, самы папулярны — белы. На вачах звычайная свечка становіцца сапраўдным творам мастацтва.

— Апускаем у жоўтую фарбу на дваццаць секунд, дастаём і вельмі хутка акунаем у халодную ваду, — адкрывае свае сакрэты майстар дзецям, што прыехалі сюды з Нясвіжскага раёна. — Цяпер — у белую, і зноў у ваду — так у нас атрымліваецца насычаны колер, — працягвае тлумачыць Наталля.

Такую працэдуру трэба праводзіць 20—25 разоў — каб свечка стала дастаткова «поўненькай» і добрага насычанага колеру.

За 10-15 хвілін матэрыял астывае, таму менавіта за гэты час свечку трэба поўнасцю ўпрыгожыць. Гэта самая карпатлівая праца — акуратна стварыць ножыкам спіралі і завіткі. У прафесійнага майстра свечка гатова за хвілін дваццаць, не больш. За дзень атрымліваецца 20—30 штук. І яшчэ дзяўчаты паспяваюць правесці некалькі майстар-класаў. Сюды з задавальненнем едуць усе тыя, хто хоча сваімі рукамі зрабіць эксклюзіўны падарунак.

Цяпер дзяўчаты рыхтуюць вялікі заказ у Нарвегію. Напярэдадні — Грэцыя. Таксама вядуцца перамовы з амерыканскімі прадпрымальнікамі.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**
*Мінскі раён.*

*ЛІЧБА ДНЯ*

## На 3,2%

***павялічыўся ў краіне ў лютым гэтага года ў параўнанні са студзенем 2014-га рэальны памер прызначаных пенсій (разлічаных з улікам змянення індэкса спажывецкіх цэн на тавары і паслугі), а ў параўнанні з лютым 2013 года — на 6%. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Сярэдні памер пенсій па ўзросце склаў у лютым Br2 млн 407,4 тыс., па інваліднасці — Br2 млн 118 тыс., з нагоды страты карміцеля — Br1 млн 533,8 тыс., сацыяльных пенсій — Br1 млн 40,6 тыс. Суадносіны сярэдняга памеру прызначаных пенсій да бюджэту пражытковага мінімуму для пенсіянераў у лютым гэтага года склалі 242,1%.***

■ Грошы

## БАЗАВАЯ ПАВЫСІЦЦА ДА 150 ТЫСЯЧ

**Базавая велічыня ў Беларусі з 1 красавіка складзе 150 тысяч беларускіх рублёў. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 255 ад 25 сакавіка 2014 года, паведамляе прэс-служба ўрада.**

Раней прагназавалася, што базавая будзе павялічана ў трэцім-чацвёртым квартале гэтага года. Нагадаем: апошнім часам гэты паказчык павышаўся двойчы: у 2012 годзе з 35 да 100 тысяч рублёў і ў 2013-м яшчэ на 30 тысяч. Цяперашні яе памер — 130 тысяч рублёў.

Павышэнне паўплывае на розныя штрафы, зборы і іншыя плацяжы. Да базавай велічыні ў нас прывязаны памеры сацыяльных выплат (напрыклад, дапамог і стыпендый) і шматлікія штрафы, а таксама стаўкі дзяржаўнай пошліны і арэнднай платы.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

ISSN 1990 - 763X

■ Камунальныя стасункі

## РАЗУМНАЕ СПАЖЫВАННЕ

### Заварыце смеццеправод — за вываз адходаў заплаціце менш

**Сёлета выканкамам і органам дзяржкіравання будуць даведзены павышаныя заданні па зборы асноўных відаў другаснай сыравіны, у тым ліку ўвядзенне дзяржзаказу, каб забяспечыць максімальную загрузку беларускіх перапрацоўчых вытворчасцяў. Пра гэта паведаміў падчас прэс-канферэнцыі міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй ШОРАЦ.**

Таксама плануецца не менш чым на 50% павялічыць сетку прыёмных пунктаў другаснай сыравіны, арганізаваць яе прыём у насельніцтва ў гандлёвай сетцы, якая ўжо існуе.

Каб павялічыць аб'ёмы збору другасных матэрыяльных рэсурсаў, Мінбудархітэктуры даручана ўнесці ў нарматыўныя акты абавязковасць стварэння прыёмных пунктаў пры праектаванні гандлёвых аб'ектаў. Амаль у кожным раёне Беларусі арганізуюць асобны комплексны збор адходаў і лініі для іх сартавання.

Апроч таго, у 2015 — 2016 гадах у Мінску, Віцебску і Гродне плануюць стварыць прадпрыемствы па сартаванні і перапрацоўцы камунальных адходаў на беларускім абсталяванні. Мінгарвыканкамам неаднойчы праводзіўся тэндар на будаўніцтва смеццеперапрацоўчага завода, але заяўленыя цэны пакуль што непад'ёмныя для бюджэту. Інвестары таксама не выказваюць зацікаўленасці, таму што тарыфы для насельніцтва павінны быць значна вышэйшымі, чым цяпер.

СТАР. 2

■ Соцыум

## ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА ПЕНСІЮ

### 9 найбольш папулярных пытанняў Міністэрству працы і сацабароны

**Ці ўключаецца праца за межамі Беларусі ў стаж пры прызначэнні пенсіі? Ці будзе павышацца пенсійны ўзрост? Хто можа разлічваць на прызначэнне пенсіі па ўзросце датэрмінова ў выпадку звальнення? Мы сабралі найбольш папулярныя пытанні аб пенсіі і пераадрасавалі іх начальніку галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Наталлі МУРАШКЕВІЧ.**

***— Які мінімальны стаж працы трэба мець, каб афарміць працоўную пенсію па ўзросце?***

— Важна адрозніваць працоўны і страхавы стаж. Так, права на працоўную пенсію па ўзросце ўзнікае пры наяўнасці мінімальнага страхавога стажу (г.зн. перыяду выплаты страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва). Зараз мінімальны страхавы стаж працы для прызначэння пенсіі па ўзросце складае 10 гадоў.

Разам з тым для прызначэння датэрміновых пенсій па ўзросце бацькам інвалідаў з дзяцінства, шматдзетным маці (нарадзілі 5 і больш дзяцей), інвалідам з дзяцінства і некаторым іншым катэгорыям грамадзян дастаткова мець мінімальны страхавы стаж, роўны 5 гадам.

***— Ці будуць залічаны ў стаж для прызначэння пенсіі перыяды работы, калі чалавек атрымліваў заробак «у канверце»?***

— Не, не будуць. У адпаведнасці з пенсійным заканадаўствам, права на пенсію і яе памер абумоўлены выплатай абавязковых страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Для большасці працадаўцаў узнос на пенсійнае страхаванне ўстаноўлены ў памеры 28% ад фонду аплаты працы, для работнікаў — 1% заробку.

СТАР. 3

## «ПРЭЗІДЭНТ ПАВІНЕН БЫЦЬ СА СВАІМ НАРОДАМ, ЯК БЫ НІ БЫЛО ЦЯЖКА»

**Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю для ўкраінскай тэлепраграмы «Шустэр Live»**

**Зробленыя падчас адказаў на пытанні прадстаўнікоў прэсы заявы Прэзідэнта Беларусі выклікалі вялікую цікавасць ва Украіне.**

Савік Шустэр, аўтар і вядучы адной з найбольш папулярных, дэмакратычных і свабодалюбівых украінскіх тэлеперадач «Шустэр Live», папрасіў Аляксандра Лукашэнку адказаць на надзённыя, няхай часам і непрыемныя, пытанні, паведамляе **БЕЛТА**. У час інтэрв'ю ў тым ліку закранalася тэма адказнасці кіраўніка дзяржавы за лёс краіны і яе народа. «Што тычыцца Януковіча: ну, які ён для мяне прэзідэнт? Вось апошняе яго выступленне: «Таварышы, спадары, я жывы, здаровы, я галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі». Адразу пытанне: «А дзе твая армія?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Прэзідэнт павінен быць са сваім народам, як бы ні было цяжка. Нават калі ў цябе заўтра будуць страляць і цябе заб'юць — твой лёс такі. Ты, значыць, павінен прынесці сябе ў ахвяру... Але ні тваім сябрам, ні тваім сваякам, ні тваім сынам за цябе сорамна потым не будзе. Вось мой падыход», — адзначыў Прэзідэнт.

## АНАТОЛЬ РУБІНАЎ УЗНАГАРОДЖАНЫ ОРДЭНАМ АЙЧЫНЫ III СТУПЕНІ

За плённую і добрасумленную працу, актыўную дзяржаўную і грамадскую дзейнасць, значны асабісты ўклад у развіццё заканадаўства, парламентарызму і міжпарламенцкага супрацоўніцтва старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль Рубінаў узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 сакавіка, паведамілі **БЕЛТА** ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы таксама падпісаў распараджэнне, у адпаведнасці з якім Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена работнікам розных сфер.

## БЕЛКАРТ выходзіць за межы краіны

■ Грошы

**Многія ўладальнікі карткі «БелКарт», калі выязджалі за мяжу, абавязкова сутыкаліся з тым, што для безнаяўных разлікаў «за кардонам» трэба было заводзіць асобную картку, якая працавала б у міжнароднай плацежнай сістэме. Таму рубам паўстала пытанне аб тым, каб стварыць кабэйджынгавую банкаўскую картку. Адметнасць яе ў тым, што яна можа працаваць адначасова ў дзвюх плацежных сістэмах — як нацыянальнай, так і міжнароднай.**

— Мы першымі ў краіне прапануем цікавы прадукт — кабэйджынгавую картку «БЕЛКАРТ-Maestro», — гаворыць **намеснік старшыні праўлення Беларусбанка Таццяна МІХАЙЛОЎСКАЯ.** — Знешне яна адрозніваецца тым, што на ёй знаходзяцца лагатыпы гэтых дзвюх сістэм. Але куды большыя адрозненні функцыянальныя. Дагэтуль жа сістэма «БЕЛКАРТ» працавала толькі ўнутры краіны. Гэта хутка стане гісторыяй: новая картка дазволіць айчыннай сістэме выйсці на міжнародны рынак. З яе дапамогай за мяжой можна будзе разлічвацца, спакойна здымаць грошы ў банкаматах — зусім як і ў Беларусі. Праўда, яна задарма даваццa не будзе. Але і дарагой яе назваць нельга. Так, сёння кошт карткі «БЕЛКАРТ-Maestro» тэрмінам дзеяння ў тры гады складае 50-60 тысяч рублёў.

— Нават у сусветнай практыцы гэтыя сумесныя праекты сустракаюцца нячаста, — гаворыць **дырэктар таварыства «Плацежная сістэма БЕЛКАРТ» Аляксандр СОТНІКАЎ.** — Што ўжо казаць пра нашу краіну, дзе праект з'яўляецца ўнікальным... Але дзякуючы яму нарэшце будзе разбураны даўні стэрэатып аб тым, што карткі нашай сістэмы з'яўляюцца выключна зарплатнымі.

Асаблівасць кабэйджынгавай карткі яшчэ і ў тым, што яна будзе адпавядаць усім ступеням абароны па сусветных стандартах. Акрамя магнітнай паласы, у яе будзе ўбудаваны чып. Зашыфраваную інфармацыю, якая ў ім знаходзіцца, скапіраваць злодзею амаль што немагчыма.

Аднак мала выпусціць карткі з чыпам — трэба яшчэ і падрыхтаваць адпаведную інфраструктуру. Таму ад усіх банкаў-эквайраў будуць патрабаваць, каб праграмнае абсталяванне, банкаматы, інфакіёскі і плацежныя тэрміналы з наступнага года працавалі з карткамі з мікрапрацэсарам.

Беларусбанк стаў першапраходцам у аб'яднанні айчыннай і міжнароднай плацежнай сістэм. Але што рабіць кліентам іншых банкаў, якія маюць картку «БелКарт»? Ці змогуць яны адчуць на сабе зручнасць новага сэрвісу?

— Наша пагадненне з сістэмай MasterCard адкрытае, — гаворыць Аляксандр Сотнікаў. — Тры буйныя беларускія банкі ўжо ініцыявалі распрацоўку аналагічнага праекта. Але па вядомых прычынах мы пакуль іх назваць не можам...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## РАЗУМНАЕ СПАЖЫВАННЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А вось стварэнне прадпрыемства па перапрацоўцы батарэек у краіне пакуль не апраўдана. Каб яго пабудаваць, неабходна сабраць 100 тон батарэек за год. Пакуль што ў краіне сабрана 27 тон за тры гады. Таму разглядаецца пытанне аб іх перапрацоўцы ў Расіі.

Па словах міністра, яшчэ недастаткова ахоплена сфера прыёму другаснай сыравіны ў насельніцтва. Таксама пакуль ёсць праблемы па перапрацоўцы складанай бытавой тэхнікі.

«Мы разглядалі гэта пытанне з гандлёвымі сеткамі, і яны зацікаўлены ў тым, каб людзі здавалі ім стары тэлевізар ці халадзільнік і атрымлівалі зніжку на новы», — сказаў міністр.

Увогуле ж у Беларусі ўтвараецца прыкладна 3,7 млн тон адходаў за год, і пакуль што з іх перапрацоўваецца крыху больш за 12%. Гэтую лічбу можна павялічыць удвая — больш другаснай сыравіны ў камунальных адходах няма. Для гэтага насельніцтва павінна бачыць выгаду ад здачы сыравіны. Апроч таго, вядзецца работа па асобным зборы другасных рэсурсаў. Зрэшты, апошняя пакуль наладжана недасканала, бо многія жыльцы карыстаюцца смеццеправодамі ў дамах, што робіць немагчымым асобны збор смецця. Па словах міністра, на заварванне смеццеправода людзі ідуць неахвотна. Таму цяпер распрацоўваецца пытанне пра ўсталяванне так званага двухстаўкавага тарыфу: калі ў двары стаяць кантэйнеры для асобнага збору другрэсурсаў і заварваецца смеццеправод, тарыф будзе ніжэйшы, чым пры наяўнасці смеццевай шахты.

У краіне рэалізуецца «Дзяржаўная праграма збору і перапрацоўкі другаснай сыравіны ў Рэспубліцы Беларусь на 2009 — 2015 гады», якую з 2013 года каардынуе Мінжылкамгас. З пачатку дзеяння праграмы аб'ёмы збору паперы павялічыліся на 161%, шкла — на 222%, палімерных адходаў — на 194%.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

## МАЁМАСЦЬ БЫЛОГА КІРАЎНІКА «БЕЛЛЕГПРАМА» АРЫШТОЎВАЮЦЬ

**Следчы камітэт прымае меры па кампенсацыі старшынёй канцэрна «Беллегпрам» і дырэктарам ААТ «Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка», якія затрыманы за хабарніцтва, шкоды дзяржаве.**

У прыватнасці, следчыя ўжо канфіскавалі больш за 1 млн долараў, залатыя зліткі, два аўтамабілі агульным коштам больш за 130 тысяч долараў, тры кватэры ў Мінску, мноства дарагой бытавой і аргтэхнікі. Цяпер, паводле слоў **афіцыйнага прадстаўніка Следчага камітэта Юліі ГАНЧАРОВАЙ,** праводзіцца работа па накладанні арышту на гэту маёмасць. Расследаванне крымінальнай справы працягваецца. Затрыманы тры хабарадавальнікі — кіраўнікі камерцыйных структур, якія ўдзельнічалі ў мадэрнізацыі прадпрыемстваў канцэрна. Усім фігурантам крымінальнай справы прад'яўлены абвінавачванні. Службовым асобам — у атрыманні хабараў, прадстаўнікам суб'ектаў гаспадарання — у дачы хабараў. Прадстаўнікі камерцыйных структур таксама знаходзяцца пад вартай.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

■ Падаходны падатак

# ПАД ІЛЬГОТЫ ТРАПІЛІ І ЖЫЛЛЁВЫЯ АБЛІГАЦЫІ


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Аб практыцы прымянення норм Падатковага кодэкса Беларусі, якія тычацца падаткаабкладання даходаў насельніцтва, і аб асноўных навінах 2014 года ў парадку вызначэння падатковай базы і прадастаўлення падатковых вылікаў расказала падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА.**

### МАТЭРЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА

Кіраўнікі дзяржаўных устаноў могуць аказваць маючым патрэбу навучэнцам і студэнтам, якія атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю ў дзённай форме, матэрыяльную дапамогу для аплаты праезду на аўтамабільным транспарце агульнага карыстання рэгулярных гарадскіх зносін, гарадскім электрычным транспарце і ў метрапалітэне. Такая матэрыяльная дапамога вызваляецца ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

Асобна Святлана Шаўчэнка паведаміла, што калі па дамове медыцынскага страхавання са страхавой арганізацыяй Беларусі прафсаюзная арганізацыя аплачвае за члена прафсаюза страхавыя паслугі, то такі даход вызваляецца ад падаходнага падатку з фізічных асоб у межах 2 млн 285 тыс. рублёў у год.

### ВЯРТАННЕ ПАДАТКАЎ ПА СІСТЭМЕ TAX FREE

На гэтую тэму на канферэнцыі было зададзена адразу некалькі пытанняў. Напрыклад, грамадзянін набыў за мяжой тавар для асабістага карыстання з афармленнем чэкаў Tax Free, на падставе якіх яму вяртаецца сума ПДВ, выплачаная ім пры набыцці тавару. Ці ўзнікае ў яго абавязак падаваць падатковую дэкларацыю (разлік) па падаходным падатку з фізічных асоб з адлюстраваннем сумы вернутага ПДВ, калі пакрыццё сумы ПДВ па чэках Tax Free ажыццяўляецца беларускім банкам? А калі чэкі Tax Free былі адпраўлены па пошце на адрас замежнай кампаніі — аператара вяртання ПДВ і гэта сума вернута замежнай кампаніяй на карт-рахунак грамадзяніна?

— У большасці краін свету ў цану набытага ў краме тавару першапачаткова ўключаны падатак на дабаўленую вартасць, памер якога ў кожнай краіне свой. У той жа час заканамі шэрагу краін прадугледжана, што такі падатак абавязаны плаціць толькі рэзідэнты гэтых краін. Каб у замежных турыстаў была магчымасць скарыстацца законнымі льготамі, было створана некалькі варыянтаў продажаў, пры якіх ПДВ альбо не бярэцца зусім, альбо можа быць кампенсаваны пры ўмове вывазу тавару з краіны, — патлумачыла Святлана Шаўчэнка.

Такім чынам, пры атрыманні грамадзянінам ПДВ, выплачанага ім пры набыцці за мяжой тавару для асабістага карыстання з афармленнем чэкаў Tax Free, аб'ект падаткаабкладання падаходным падаткам з фізічных асоб адсутнічае.

### АБ ДАХОДАХ У НАТУРАЛЬНАЙ ФОРМЕ І ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ

Спецыяліст паведаміла, што сёлета падатковая база падатку з фізічных асоб у дачыненні да даходаў, атрыманых у натуральнай форме, пры адсутнасці рэгуляваных розничных цэн прымаецца ў памеры кошту, што вызначаны арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі на дату налічэння плацельшчыку даходу.

**Каб у замежных турыстаў была магчымасць скарыстацца законнымі льготамі, было створана некалькі варыянтаў продажаў, пры якіх ПДВ альбо не бярэцца зусім, альбо можа быць кампенсаваны пры ўмове вывазу тавару з краіны.**

Удасканалены парадак падаткаабкладання даходаў фізічных асоб, атрыманых па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, у сувязі з чым артыкул 160 Падатковага кодэкса выкладзены ў новай рэдакцыі. Яна вызначае фінансавы інструмент тэрміновых здзелак, вытворных фінансавых інструментаў, устанаўлівае, што прызнаецца даходамі па аперацыях з каштоўнымі паперамі, базісным актывам фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак і выдаткамі па такіх аперацыях. Гэты дакумент рэгламентуе парадак вызначэння падатковай базы, а таксама вылічэнне і выплату падаходнага падатку з фізічных асоб па такіх здзелках.

### ПАДАТКОВЫЯ ВЫЛІКІ ПРЫ БУДАЎНІЦТВЕ ЖЫЛЛЯ

Спадарыня Шаўчэнка адзначыла, што ў артыкул 166 Падатковага кодэкса ўнесены шэраг дапаўненняў. Цяпер плацельшчыку і членам яго сям'і, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўляецца маёмасны падатковы вылік на будаўніцтва кватэры шляхам набыцця жыллёвых аблігацый у межах памеру грашовых сродкаў, што падлягаюць унясенню ў аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый. Гэты кошт указаны ў дагаворы, дзе прадугледжваецца будаўніцтва жылога памяшкання для ўладальніка жыллёвых аблігацый. Іншымі словамі, пры выкананні ўсіх іншых умоў плацельшчык мае права на такі вылік з моманту фактычнага ажыццяўлення ім расходаў на набыццё жыллёвых аблігацый. Раней такі вылік даваўся з моманту падпісання бакамі акта прыёмкі-перадачы жылога памяшкання.

Для прадастаўлення такога маёмаснага падатковага выліку плацельшчык і члены яго сям'і дадаткова павінны прадаставіць падатковаму агенту або падатковаму органу копіі дагавора, які прадугледжвае будаўніцтва жылога памяшкання для ўладальніка жыллёвых аблігацый, а таксама дакументы, якія пацвярджаюць фактычныя выдаткі на набыццё жыллёвых аблігацый.

Сёлета такі ж парадак па вызначэнні маёмаснага падатковага выліку для «чаргавікоў» дзейнічае і ў дачыненні да расходаў на пагашэнне крэдытаў беларускіх банкаў, пазык, якія атрыманы ад беларускіх арганізацый і (або) беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў (уключаючы працэнты па іх, за выключэннем працэнтаў, што выплачваюцца за нясвоечасовае вяртанне крэдытаў і пазык або нясвоечасовую выплату працэнтаў па іх).

Іншымі словамі, сёлета для мэт падаткаабкладання падаходным падаткам з фізічных асоб расходы на набыццё жыллёвых аблігацый прыраўноўваюцца да выдаткаў на будаўніцтва кватэры.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ**

■


## ОАО «УНИВЕРМАГ «СОЛИГОРСК»

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА**

(в млн руб.)

| АКТИВ | Код строки | На конец года | На начало года |
|---|---|---|---|
| **1. Долгосрочные активы** | | | |
| Основные средства: | 110 | 31139 | 30022 |
| Нематериальные активы | 120 | 32 | 2 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 5349 | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 111 | 271 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 12 | 12 |
| Отложенные налоговые обязательства | 160 | - | 7 |
| **ИТОГО по разделу 1** | **190** | **36643** | **30314** |
| **2. Краткосрочные активы** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 19517 | 17896 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 28 | 31 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 250 | 1529 | 1490 |
| Денежные средства | 270 | 938 | 2260 |
| **ИТОГО по разделу 2** | **290** | **22012** | **21677** |
| **БАЛАНС (190+290)** | 300 | 58655 | 51991 |
| **ПАССИВ** | **Код строки** | **На начало года** | **На конец года** |
| **3. Собственный капитал** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 7760 | 7760 |
| Добавочный фонд | 450 | 24449 | 18496 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | 3717 | 3818 |
| Целевое финансирование | 480 | - | 2 |
| **ИТОГО по разделу 3** | **490** | **35926** | **30076** |
| **4. Долгосрочные обязательства** | 590 | - | - |
| **5. Краткосрочные обязательства** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 767 | 77 |
| Кредиторская задолженность | 630 | 21962 | 21828 |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | 10 |
| **ИТОГО по разделу 5** | **690** | **22729** | **21915** |
| **БАЛАНС (490+690)** | **700** | **58655** | **51991** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА ЯНВАРЬ–ДЕКАБРЬ 2013 ГОДА**

| Наименование показателя | Код строки | За январь–декабрь 2013 года | За январь–декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 142 512 | 131 934 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ услуг | 020 | (112 164) | (106 154) |
| Расходы на реализацию, управленческие расходы | 050 | (29763) | (23833) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (010-020-050) | 060 | 585 | 1 947 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 368 | 1516 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 150 | 338 | (186) |
| Прибыль ((убыток) до налогообложения (090+150) | 160 | 706 | 1 330 |
| Налог на прибыль | 170 | (205) | (421) |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (7) | 7 |
| Чистая прибыль | 210 | 494 | 916 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 5 953 | 8 206 |

**Информация о выплате дивидендов**

**Уважаемые акционеры ОАО «Универмаг «Солигорск»!**

Решением общего собрания акционеров от 25 марта 2014 года принято решение о выплате дивидендов акционерам ОАО «Универмаг «Солигорск»

**Выплата дивидендов производится**:

**работникам Общества** одновременно с выплатой заработной платы путем: зачисления на карт-счета, по ведомости в центральной кассе по месту нахождения Общества;

**иным акционерам** по ведомости в центральной кассе по месту нахождения Общества либо по их заявлению высылать почтовым переводом или перечислять на счет в банке. Расходы по пересылке (перечислению) дивидендов в пределах Республики Беларусь производить за счет средств Общества.

**Период выплаты дивидендов** – с 01.04.2014 года до 01.05.2014 года.

# ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА ПЕНСІЮ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Перыяды работы, на працягу якіх выплата страхавых узносаў не рабілася хаця б адным з бакоў, не ўключаюцца ў стаж і ў заробак для вылічэння пенсіі.

Для таго, каб максімальна засцерагчы сябе ад такіх непрыемных «сюрпрызаў» пры афармленні пенсіі, па-першае, не варта згаджацца на падобныя ўмовы працы, а па-другое, можна скарыстацца сваім правам на атрыманне інфармацыі з сістэмы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, у прыватнасці, аб выплаце абавязковых страхавых узносаў. Каб атрымаць гэтую інфармацыю, трэба звярнуцца ў раённы аддзел Фонду сацабароны насельніцтва па месцы жыхарства або па месцы знаходжання сваёй арганізацыі.

***— Як можна павялічыць сваю пенсію?***

— Такая магчымасць прадугледжана заканадаўствам пры звароце па пенсію ва ўзросце, пазнейшым за агульнаўстаноўлены пенсійны ўзрост (або пры адмове ад атрымання ўжо прызначанай пенсіі па ўзросце), калі пры гэтым маецца стаж працы не менш за 20/25 гадоў (адпаведна ў жанчын і мужчын).

За першы поўны год працы пасля агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту без атрымання пенсіі яна будзе павялічана на 6% заробку, які прымаецца для яе вылічэння, за другі — на 8%, за трэці — на 10%, за чацвёрты — на 12%, за пяты і кожны наступны год — на 14%.

Калі праца без атрымання пенсіі працягваецца менш за год, то павелічэнне за кожныя поўныя два месяцы такой працы складае 1% заробку. Пры гэтым пенсія максімальным памерам (75% заробку) не абмяжоўваецца.

У выніку за 5 гадоў працы без атрымання пенсіі яе памер павялічыцца ў 1,7-2 разы.

***— Па дасягненні 50-гадовага ўзросту жанчына атрымала датэрміновую пенсію па ўзросце як шматдзетная маці. Ці будзе ўлічаны час працы пасля прызначэння пенсіі для яе вылічэння?***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Час працы пасля прызначэння пенсіі па ўзросце, у тым ліку датэрміновай (напрыклад, за работу з асаблівымі ўмовамі працы, шматдзетнай маці, маці дзіцяці-інваліда і г.д.), залічваецца ў стаж для вылічэння памеру пенсіі толькі ў выпадку, калі пенсіянер не атрымліваў пенсію ў гэты перыяд.

***— Хто можа разлічваць на прызначэнне пенсіі па ўзросце датэрмінова ў выпадку звальнення?***

— Датэрмінова, але не раней чым за адзін год да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, можа быць прызначана пенсія чалавеку, які прызнаны беспрацоўным і мае права на атрыманне дапамогі па беспрацоўі на працягу не менш як 52 каляндарных тыдняў. Права на датэрміновую пенсію па ўзросце са згоды заяўніка вызначае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне толькі пры адсутнасці магчымасці яго працаўладкавання.

Таксама прызначэнне пенсіі па ўзросце датэрмінова — адна з гарантый для грамадзян, звольненых у сувязі з ліквідацыяй арганізацыі. У гэтым выпадку права на датэрміновую пенсію па ўзросце таксама вызначае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Але пры гэтым павінны быць выкананы наступныя ўмовы: звальненне ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі, адсутнасць магчымасці для працаўладкавання і наступленне неабходнага ўзросту — не раней чым за два гады да дасягнення вызначанага заканадаўствам узросту, які дае права на пенсію на агульных падставах.

Варта звярнуць увагу, што абавязковай умовай для прызначэння датэрміновай пенсіі і ў першым, і ў другім выпадках з'яўляецца адсутнасць магчымасці працаўладкавання. Таксама неабходна наяўнасць патрабаванай працягласці мінімальнага страхавога стажу (не менш за 10 гадоў) і агульнага стажу працы.

***— Ці ўключаецца праца за межамі Беларусі ў стаж пры прызначэнні пенсіі і пры якіх умовах?***

— У стаж працы залічваюцца перыяды працы, у тым ліку той, што працякала за мяжой, пры ўмове, што на працягу гэтых перыядаў ажыццяўлялася выплата абавязковых страхавых узносаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні.

Пры накіраванні работнікаў у камандзіроўку за мяжу пералік узносаў у Фонд сацыяльнай абароны ажыццяўляецца іх працадаўцамі ў вызначаным заканадаўствам парадку.

Што тычыцца асоб, якія працуюць за межамі нашай краіны і не знаходзяцца ў працоўных адносінах з працадаўцам на тэрыторыі Беларусі, то Законам «Аб асновах дзяржаўнага сацыяльнага страхавання» ім прадастаўлена права самастойна выплачваць узносы на пенсійнае страхаванне ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва ў памеры 29% ад вызначанага імі даходу.

Для гэтага чалавеку неабходна стаць на ўлік у якасці плацельшчыка узносаў у аддзяленне Фонду па месцы жыхарства ў Беларусі. Усе пытанні, звязаныя з парадкам пералічэння узносаў, растлумачваюцца пры пастаноўцы на ўлік.

Таксама неабходна ўлічваць, што ў выпадку выплаты ўзносаў з даходу, ніжэйшага за мінімальную заработную плату (з улікам індэксацыі), стаж для прызначэння пенсіі будзе вылічацца з улікам папраўчага каэфіцыента.

І яшчэ. Згодна з пенсійным заканадаўствам, у тых выпадках, калі пагадненнямі (дагаворамі) аб сацыяльным забеспячэнні паміж Рэспублікай Беларусь і іншымі дзяржавамі прадугледжаны іншыя правілы, адпаведна прымяняюцца правілы, вызначаныя гэтымі пагадненнямі (дагаворамі).

Такія пагадненні (дагаворы) заключаны паміж дзяржавамі — удзельнікамі СНД (за выключэннем Азербайджана), а таксама з Літвой і Латвіяй. З палажэннямі гэтых пагадненняў можна азнаёміцца ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

***— У якім памеры ажыццяўляецца выплата пенсій асобам, якія знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах для састарэлых на дзяржаўным забеспячэнні?***

— Тым, хто знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні ў дзяржаўных стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання, у тым ліку ў дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў, выплачваецца 10% прызначанай пенсіі, але не менш за 20% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце. У выпадках, калі памер іх пенсіі перавышае кошт утрымання ва ўстанове, выплачваецца розніца паміж пенсіяй і коштам утрымання, але не менш за 10% прызначанай пенсіі і не менш за 20% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

Інвалідам вайны і іншым удзельнікам вайны пенсіі выплачваюцца ў такім жа парадку, але не менш за 25% прызначанай пенсіі і не менш за 20% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

Калі пенсіянер з'язджае з дома-інтэрната на тэрмін звыш аднаго месяца (без адлічэння з яго), пенсія яму выплачваецца ў поўным памеры.

***— Чаму для атрымання пенсіі па пластыкавай картцы неабходна штогод афармляць заяву?***

— Пенсія можа выплачвацца праз банк (пры наяўнасці заключанага дагавора); арганізацыю паштовай сувязі; арганізацыю, якая ажыццяўляе дзейнасць па дастаўцы пенсій. Права выбару спосабу выплаты (дастаўкі) пенсіі належыць пенсіянеру.

Усталяванне абмежавання тэрміну дзеяння заявы аб пералічэнні пенсіі на карт-рахунак у падраздзяленне банка — адзін са спосабаў забяспечыць кантроль за мэтавым расходаваннем пенсійных сродкаў. Справа ў тым, што пры выплаце пенсій праз арганізацыі паштовай сувязі або па дастаўцы пенсій забяспечваецца непасрэдны кантакт асобы, якая выплачвае пенсію, і пенсіянера, а пры атрыманні пенсіі па пластыкавай картцы банка немагчыма ведаць, хто ёю фактычна карыстаецца і ці жывы пенсіянер. Таму заканадаўствам вызначана патрабаванне пра гадавы тэрмін дзеяння заявы аб пералічэнні пенсіі на карт-рахунак у падраздзяленне банка. Патрабаванне да атрымальніка сацыяльных выплат пацвердзіць знаходжанне ў жывых з'яўляецца стандартным і шырока ўжываецца ў практыцы, у тым ліку міжнароднай.

***— Ці будзе павышацца пенсійны ўзрост?***

— У Беларусі не плануецца павышаць пенсійны ўзрост. Але дасягненне работнікамі 55 і 60 гадоў не з'яўляецца прычынай для іх звальнення, бо ў гэтым узросце людзі ўжо прафесіяналы сваёй справы, і іх вопыт і веды могуць быць карыснымі наймальніку. Мы будзем стымуляваць больш позні выхад на пенсію. Зараз пры заробку, вышэйшым за сярэдні, чалавеку выгадна як мага даўжэй працаваць без атрымання пенсіі.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Дарэчы

## ПАРАДАК ВЫПЛАТЫ ПЕНСІІ ПРАЦУЮЧЫМ ПЕНСІЯНЕРАМ ЗМЯНЯЦЦА НЕ БУДЗЕ

**Пра гэта ўчора паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ на анлайн-канферэнцыі па пенсійным забеспячэнні, якая прайшла на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

У прыватнасці, ён заявіў, што «цяпер пытанне аб змяненні парадку выплаты пенсіі працуючым пенсіянерам не прапрацоўваецца».

Таксама не будзе пераглядацца ўзроставы парог для пенсійных бонусаў. Як вядома, з 1 студзеня 2012 года ўстаноўлена штомесячная мэтавая даплата да пенсій непрацуючых пенсіянераў, якім больш за 75 гадоў. Яна складае для тых, хто дасягнуў 75 гадоў, 75% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце, для тых, хто дасягнуў 80 гадоў, — 100% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце. Даплата ўстанаўліваецца з 1-га чысла месяца, наступнага за месяцам дасягнення ўзросту 75 (80) гадоў.

* * *

На ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў лютым гэтага года знаходзіліся 2 млн 536 тыс. пенсіянераў.

**Святлана БУСЬКО**

■


УНП 300082076

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года**

ОАО «Витебские ковры» (млн руб.)

| АКТИВЫ | На конец отчетного периода | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | |
| Основные средства (110) | 210104 | Уставный капитал (410) | 15022 |
| Нематериальные активы (120) | 577 | Резервный капитал (440) | 10859 |
| Вложения в долгосрочные активы (140) | 21725 | Добавочный капитал (450) | 294821 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 1 | Нераспределенная прибыль (460) | - |
| **ИТОГО по разделу 1 (190)** | **232407** | **ИТОГО по разделу III (490)** | **320702** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | |
| Запасы (210), в т.ч.: | 92589 | Долгосрочные кредиты, займы (510) | 50566 |
| незавершенное производство (213) | 20239 | Доходы будущих периодов (540) | 2245 |
| готовая продукция и товары для реализации (214) | 24073 | **ИТОГО по разделу IV (590)** | **52811** |
| товары отгруженные, (215) | - | **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | |
| Расходы будущих периодов (230) | 223 | Краткосрочные кредиты и займы (610) | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным ценностям (240) | 8398 | Краткосрочная кредиторская задолженность (630), в т.ч.: | 46549 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность (250) | 66857 | поставщикам, подрядчикам, исполнителям (631) | 21879 |
| Денежные средства и их эквиваленты (270) | 4255 | по авансам полученным (632) | 385 |
| Прочие краткосрочные активы (280) | 15212 | по налогам и сборам (633) | 2130 |
| **ИТОГО по разделу II (290)** | **187655** | по социальному страхованию и обеспечению (634) | 1100 |
| | | по оплате труда (635) | 5082 |
| | | собственнику имущества (учредителям, участникам) (637) | 6915 |
| | | прочим кредиторам (638) | 9058 |
| | | **ИТОГО по разделу V (690)** | **46549** |
| **БАЛАНС** | | **БАЛАНС (490+590+690)** | **420062** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2013 ГОД** (млн руб.)

| Наименование показателя | За отчетный период |
|---|---|
| I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг (010) | 633990 |
| Себестоимость реализованной продукции (030+040+050) | 512379 |
| Прибыль(убыток) от реализации (060) | 75278 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности в (090) | 51780 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (150) | -2018 |
| Налог на прибыль | 7256 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (200) | 237 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (210) | 42269 |

**ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИОНЕРАХ:**

Общее годовое собрание акционеров проведено 26.03.2014 г.
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде 6 222,0 млн руб.
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию, включая налоги: 20 710 руб.
Срок выплаты дивидендов: с 9.12.2014 по 31.12.2014.
Обеспеченность акции имуществом общества: 1 067,5 тыс. руб.
Количество акционеров – 3688, в том числе 2 юридических лица.
Среднесписочная численность 1352 человека.
Основной вид деятельности – производство ковров и ковровых изделий.

**Генеральный директор** **Е.Е.Черепнина**
**Главный бухгалтер** **А.Н. Шевченко**


■ Ліставанне

## «ЗВЯЗДУ» БУДУ ЧЫТАЦЬ, ПАКУЛЬ ЗМАГУ!»

Добры дзень, дарагая рэдакцыя!

Даўно ўжо я збіралася напісаць, засведчыць вам сваю павагу. Раблю гэта, дасылаючы картку на розыгрыш прызоў. Калі выпадзе выйграць (а гэта ўжо здаралася), буду рада ўдвайне. Бо газету выпісваю... шчыра кажучы, не памятаю, колькі гадоў. Але ж дзякуючы менавіта ёй я вярнулася да беларускай мовы. Быў грэх: пачала крыху забываць, бо, жывучы ў горадзе, яе, можа, па радыё толькі і пачуеш. Не вельмі давалася спярша і чытанне: вока «чаплялася» за нейкія словы...

Цяпер чытаю лёгка і з задавальненнем. Летась, каюся, на адзін квартал не падпісалася (здалося — дорага), дык моцна сумавала. Таму цяпер ужо вырашыла, што газеце здраджваць не буду. «Звязду» буду выпісваць і чытаць, пакуль змагу.

**Т.В. Калініна,** *г. Брэст.*

*А вы не забыліся, паспелі падпісацца? Сёння яшчэ не позна!*

*Выслаць картку на розыгрыш прызоў, дарэчы, — таксама.*

■

■ Сёння — Міжнародны дзень тэатра

## «ПАЎЛІНКА» ЯК СІМВАЛ СВЯТА

**Гэта не проста гераіня спектакля паводле п'есы Купалы, які стаў візітоўкай аднаго з беларускіх тэатраў.**

Сёння ў Нацыянальным акадэмічным рускім драматычным тэатры імя М. Горкага на сустрэчу з «Паўлінкай» збяруцца дзеячы айчынных тэатраў: у дзень прафесійнага свята назавуць уладальніка прэстыжнай прафесійнай прэміі, якую заснаваў Саюз тэатральных дзеячаў. Прыз «Хрустальная Паўлінка» (за ўнёсак у развіццё айчыннага тэатральнага мастацтва) сёлета ўручаюць ужо ў 21 раз. Першай яе атрымала Стэфанія Станюта. Але ёсць яшчэ шэраг прэмій СТД у розных намінацыях.

Таксама ў гэты святочны дзень у тэатры імя Горкага адбудзецца грамадскі прагляд камедыі «Выхадкі Ханумы» паводле А. Цагарэлі на музыку Гія Канчэлі. Спектакль, які ставіць Сяргей Кавальчык, разлічаны на шырокае кола гледачоў.

Зрэшты, усё тое, што адбываецца ў Міжнародны дзень тэатра на падмостках, разлічана найперш на гледача. Кожны тэатр у гэты дзень ладзіць капуснікі, прэм'еры, сустрэчы.

— У мяне да гэтага свята маладзёжна-цёплыя адносіны яшчэ з часу працы ў Купалаўскім тэатры, — прызнаецца мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Аляксандр Гарцуеў. — Мы заўсёды рабілі капуснікі. Гэта была магчымасць інакш раскрыцца перад публікай. І ў тэатры, дзе я працую сёння, ёсць традыцыя рабіць капуснікі. Такім чынам, да нашага прафесійнага свята мы рыхтуем сваім гледачам падарунак.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■

ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «1-Й "А". ЛЮБОВЬ С ПЕРВОГО КЛАССА»

Настоящие правила проведения рекламной игры «1-й "А". Любовь с первого класса» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под торговой маркой «1-й "А"», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «1-й "А". Любовь с первого класса» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**Упаковка –** специальная упаковка товаров, участвующих в Рекламной игре, с информацией о Рекламной игре на лицевой стороне и с Игровой комбинацией из трех символов на внутренней стороне.

**Игровые комбинации –** цифровая комбинация из трех чисел, которая располагается на внутренней стороне Упаковки.

**Категория приза –** порядковый номер, присвоенный каждому виду призов, составляющих призовой фонд Рекламной игры:

1. Смартфон
2. Ноутбук
3. Холодильник
4. Телевизор
5. Автомобиль

**1. Организатор**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар квадрат», УНП 191682518, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 7 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191682518 (далее – Организатор). Местонахождение Организатора: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Амураторская, д. 4Б, пом. 20.

Заинтересованным лицом является Совместное общество с ограниченной ответственностью «Ингман мороженое», зарегистрированное 29 апреля 2009 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №490419896; юридический адрес: 246028, Республика Беларусь, г. Гомель, ул. Университетская, д. 3, УНП 490419896 (далее – Заинтересованное лицо).

**2. Участники**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

В Рекламной игре не имеют права участвовать граждане, привлеченные на основании гражданско-правовых договоров для обслуживания Рекламной игры в любой форме, а также члены семей таких граждан.

**3. Название Рекламной игры: «1-й "А". Любовь с первого класса».**

**4. Территория проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.**

**5. Срок начала Рекламной игры: 1 апреля 2014 г.**

**6. Срок окончания Рекламной игры: 15 сентября 2014 г.**

**7. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:**

товары, выпускаемые под товарным знаком «1-й "А"», а именно:

● мороженое пломбир с ароматом ванилина в какаосодержащей глазури, эскимо «1-й "А"», 70 граммов;

● мороженое пломбир со вкусом фундука в какао-молочной глазури с фундуком, эскимо «1-й "А"», 70 граммов;

● мороженое пломбир с ароматом ванилина на палочке «1-й "А"», 70 граммов;

● мороженое пломбир шоколадный в вафельном стаканчике «1-й "А"», 80 граммов;

● мороженое пломбир с ароматом ванилина с сиропом крем-брюле в вафельном стаканчике «1-й "А"», 80 граммов;

● мороженое пломбир с ароматом ванилина в вафельном стаканчике «1-й "А"», 80 граммов.

В рекламной игре участвует весь товар, указанный в п. 7 настоящих Правил (далее Игровой продукт), со специальной упаковкой (далее – Упаковка), имеющий на лицевой стороне Упаковки информацию о Рекламной игре «1-й "А". Любовь с первого класса».

**8. Призовой фонд Рекламной игры**

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица в размере **501 518 816** (пятьсот один миллион пятьсот восемнадцать тысяч восемьсот шестнадцать) белорусских рублей. Призовой фонд рекламной игры включает следующие призы:

| № | Вид приза | Кол-во, шт. | Цена, бел. руб. | Общая стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Автомобиль «КИА РИО»: тип кузова: четырехдверный седан, тип привода: привод на передние колеса, двигатель: объем 1,4 литра, бензин, 4 цилиндра в ряд, 16 клапанов, 107 л.с., КПП: пятиступенчатая механическая коробка передач, год выпуска: 2014, цвет автомобиля: серебристый металлик, цвет салона: черный (SATURN BLACK) | 2 | 148 998 285 | 297 996 570 |
| | и денежное вознаграждение в размере 20 317 948 белорусских рублей | 2 | 20 317 948 | 40 635 896 |
| 2. | Сотовый телефон GSM SAMSUNG, GT-i8190,белый, РОССИЯ | 10 | 2 685 000 | 26 850 000 |
| | и денежное вознаграждение в размере 366 136 белорусских рублей | 10 | 366 136 | 3 661 360 |
| 3. | Сотовый телефон SAMSUNG i8190 Galaxy S III mini TA, серый, РФ | 9 | 2 685 000 | 24 165 000 |
| | и денежное вознаграждение в размере 366 136 белорусских рублей | 9 | 366 136 | 3 295 224 |
| 4. | Сотовый телефон GSM SAMSUNG GT -i8190, металл, синий, РФ | 1 | 2 685 000 | 2 685 000 |
| | и денежное вознаграждение в размере 366 136 белорусских рублей | 1 | 366 136 | 366 136 |
| 5. | Телевизор ЖК SAMSUNG UE32F4000AWXRU, РФ | 5 | 3 400 000 | 17 000 000 |
| | и денежное вознаграждение в размере 463 636 белорусских рублей | 5 | 463 636 | 2 318 180 |
| 6. | Холодильник Samsung RB28FEJMDSA/RS, РФ | 5 | 6 072 000 | 30 360 000 |
| | и денежное вознаграждение в размере 828 000 белорусских рублей | 5 | 828 000 | 4 140 000 |
| 7. | Мобильный ПК Acer Notebook Aspire E1-530G-21174G75Mnkk 15.6» HD LED, Intel® Pentium® 2117U, DDR3 4GB, 750GB HDD, GeForce GT 720M 1 GB VRAM, DVD SM, WiFi, BT, Linux, 2,4 kg, black,NX.MEUEU.005, РФ | 10 | 4 228 000 | 42 280 000 |
| | и денежное вознаграждение в размере 576 545 белорусских рублей | 10 | 576 545 | 5 765 450 |
| | **ИТОГО** | **84** | | **501 518 816** |

**9. Порядок участия в Рекламной игре и получения призов:**

**9.1. Условия участия в Рекламной игре:**

Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 1 апреля по 31 июля 2014 г.:

● Купить Игровой продукт;

● Найти на внутренней стороне Упаковки Игровую комбинацию из трех цифр;

игровая комбинация является выигрышной при условии наличия в ней трех одинаковых цифр, соответствующих категории призов:

1) смартфон – 111;
2) ноутбук – 222;
3) холодильник – 333;
4) телевизор – 444;
5) автомобиль – 555.

Если на внутренней части Упаковки размещено менее 3 одинаковых цифр, соответствующих категорий призов, то участник может собрать выигрышную Игровую комбинацию путем добавления недостающих цифр в Игровую комбинацию из второй Упаковки. Собрать выигрышную Игровую комбинацию можно не более чем из двух Упаковок.

***Пример выигрышной комбинации:***

1-й пример:

Участник Рекламной игры приобрел Игровой продукт, обнаружил на внутренней части упаковки игровую комбинацию «111» – это означает, что комбинация выигрышная и соответствует категории приза – Смартфон.

2-ой пример:

Участник Рекламной игры приобрел Игровой продукт, обнаружил на внутренней части упаковки одну из игровых комбинаций, например: «118»,«922», «123» – это означает, что комбинация не выигрышная, но Участник может дополнить ее недостающим количеством цифр «1» или «2» из игровых комбинаций, например: «156», «824», «212», во второй упаковке приобретенного Игрового продукта, чтобы общее количество одинаковых цифр «1» или «2» было не менее трех и соответствовало одной из выигрышных игровых комбинаций («111» или «222», Смартфон или Ноутбук соответственно), аналогично с другими цифровыми комбинациями.

Отправить по почте на адрес: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Амураторская, д. 4Б, пом. 20 одну или две Упаковки содержащие в выигрышную Игровую комбинацию, и логотипом продукта «1-й "А"». В письме также должна содержаться следующая информация об Участнике: фамилия, имя, отчество (при его наличии), почтовый адрес Участника: почтовый индекс (желательно), область (желательно), район (желательно), населенный пункт, улица, дом, корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии), а также адрес электронной почты (желательно) и номер мобильного телефона (желательно) Участника.

**9.2. К участию в Рекламной игре не принимаются:**

письма, отправленные Участником ранее 1 апреля 2014 г. и после 31 июля 2014 г. по штемпелю отправления;

письма, полученные после 3 августа 2014 г. по штемпелю получения;

письма, присланные по почте не с территории Республики Беларусь. Пункты отправления определяются по почтовому штемпелю отправления на конверте;

письма, заполненные неразборчиво либо неполно в соответствии с п. 9.1 настоящих Правил;

письма, содержащие неподлинные игровые Упаковки от Игровых продуктов (в случае сомнений в подлинности проводится оценка их подлинности Комиссией по проведению Рекламной игры);

письма, содержащие Игровые комбинации на Упаковках от Игровых продуктов, в результате механических повреждений которых невозможно определить информацию об Игровых комбинациях или логотип продукта «1-й "А"».

**9.3. Розыгрыш Призового фонда:**

9.3.1.Розыгрыш призового фонда проводится по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, г. Минск, ул. Амураторская, 4Б, офис 20.

Время и даты проведения розыгрышей призового фонда:

| № | Участвуют все Письма, полученные в период (по почтовому штемпелю) | Дата и время розыгрыша | Порядок розыгрыша Призов |
|---|---|---|---|
| 1 | 01.04.2014 – 18.04.2014 включительно | 20.04.2014 в 11.00 | 1. Смартфон<br>2. Ноутбук<br>3. Холодильник<br>4. Телевизор<br>5. Автомобиль |
| 2 | 19.04.2014 – 02.05.2014 включительно | 04.05.2014 в 11.00 | |
| 3 | 03.05.2014 – 16.05.2014 включительно | 19.05.2014 в 11.00 | |
| 4 | 17.05.2014 – 30.05.2014 включительно | 02.06.2014 в 11.00 | |
| 5 | 31.05.2014 – 13.06.2014 включительно | 16.06.2014 в 11.00 | |
| 6 | 14.06.2014 – 27.06.2014 включительно | 30.06.2014 в 11.00 | |
| 7 | 28.06.2014 – 11.07.2014 включительно | 14.07.2014 в 11.00 | |
| 8 | 12.07.2014 – 25.07.2014 включительно | 28.07.2014 в 11.00 | |
| 9 | 26.07.2014 – 03.08.2014 включительно | 04.08.2014 в 11.00 | |
| 10 | 01.04.2014 – 03.08.2014 за исключением писем Победителей предыдущих розыгрышей | 14.08.2014 в 11.00 | Нераспределенный призовой фонд |

**9.3.2. Участниками Розыгрышей призового фонда становятся только те Участники, кто первым выполнил условия, предусмотренные настоящими Правилами.**

При Розыгрыше призового фонда ведется учет даты получения писем с выигрышными игровыми комбинациями на адрес Организатора в соответствии с почтовым штемпелем получения.

В каждом Розыгрыше определяются Победители среди первых приславших выигрышные Игровые комбинации по каждой категории призов до тех пор, пока не будут разыгран весь Призовой фонд.

**Призы первой категории (смартфон)**

Первые 20 (двадцать) Участников, приславшие выигрышную Игровую комбинацию на одной или двух Упаковках, соответствующих 1-й категории приза (смартфон), и выполнившие условия Рекламной игры п. 2 и 9.1, могут получить приз первой категории в последовательности, указанной в п.8 настоящих Правил.

**Призы второй категории (ноутбук)**

Первые 10 (десять) Участников, приславшие выигрышную Игровую комбинацию на одной или двух Упаковках, соответствующих 2-й категории приза (ноутбук), и выполнившие условия Рекламной игры п. 2 и 9.1, могут получить приз второй категории.

**Призы третьей категории (холодильник)**

Первые 5 (пять) Участников, приславшие выигрышную Игровую комбинацию на одной или двух Упаковках, соответствующих 3-й категории приза (холодильник), и выполнившие условия Рекламной игры п. 2 и 9.1, могут получить приз третьей категории.

**Призы четвертой категории (телевизор)**

Первые 5 (пять) Участников, приславшие выигрышную Игровую комбинацию на одной или двух Упаковках, соответствующих 4-й категории приза (телевизор) и выполнившие условия Рекламной игры п. 2 и 9.1, могут получить приз четвертой категории.

**Призы пятой категории (автомобиль)**

Первые 2 (два) Участника, приславшие выигрышную Игровую комбинацию на одной или двух Упаковках, соответствующих 5-й категории приза (автомобиль), и выполнившие условия Рекламной игры п. 2 и 9.1, могут получить приз пятой категории.

В случае если на день Розыгрыша Призового фонда количество призов одной из категорий меньше чем присланных писем с выигрышными игровыми комбинациями по соответствующей категории призов, то Победители в данной категории призов определяются случайным образом с помощью лототрона и в присутствии Комиссии.

**9.3.3.** В случае если за период с 1 апреля 2014 г. по 4 августа 2014 г. включительно не был проведен Розыгрыш призового фонда в полном объеме (далее Нераспределенный призовой фонд), по причине отсутствия присланных писем с выигрышными Игровыми комбинациями по какой-либо из категорий призов и удовлетворяющих условиям настоящих Правил, Организатор проводится Розыгрыш Нераспределенного призового фонда по следующей механике:

● Для Розыгрыша Нераспределенного призового фонда принимаются все присланные письма за период с 1 апреля 2014 г. по 4 августа 2014 г. включительно с любыми выигрышными игровыми комбинациями (за исключением писем Победителей предыдущих Розыгрышей) и соответствующие условиям п .9.1;

● Победители в каждой категории призов (если таковые остались после основного Розыгрыша), начиная с первой, определяются случайным образом с помощью лототрона и в присутствии Комиссии.

**9.4. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша**

Победители Рекламной игры извещаются о выигрыше заказным письмом с извещением, высланным Организатором в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения каждого Розыгрыша на адрес, указанный Победителем в письме с присланной выигрышной Игровой комбинацией.

**9.4.1.** Победитель, определенный с 20 апреля 2014 г. по 4 августа 2014 г. должен до 11 августа 2014 г. связаться с организатором Рекламной игры по телефону горячей линии: (+375 17) 239-06-56 и согласовать дату и время получения приза (не позднее 13 августа 2014 г.).

В случае если Победитель Рекламной игры, определенный с 20 апреля 2014 г. по 4 августа 2014 г. не связался с Организаторами Рекламной игры для получения приза в установленные сроки, не забрал приз в установленные Правилами сроки, официально отказался от Приза, такой Приз разыгрывается Организатором Рекламной игры 14 августа 2014 г.

Победители, определенные 14 августа 2014 г., должны не позднее 20 августа 2014 г. связаться с Организатором Рекламной игры по телефону горячей линии: (+375 17) 239-06-56 и согласовать дату и время получения приза (не позднее 25 августа 2014 г.).

**9.4.2.** В соответствии с требованиями Особенной части Налогового кодекса Республики Беларусь при выдаче Призов Организатор удерживает и перечисляет подоходный налог с суммы Приза в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Победители Рекламной игры, выигравшие Приз, обязуются предоставить Организатору следующие личные данные при получении приза: а) ксерокопию страницы 25, страниц 31-33 паспорта – для граждан Республики Беларусь; б) ксерокопию страницы 3, страниц 15-17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь.

● Призы считаются переданными победителю с момента передачи и подписания акта выдачи призов.

Призы 1-4-й категорий (смартфон, ноутбук, холодильник, телевизор) можно будет получить по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, Амураторская, 4Б, пом. 20.

● Приз 5-й категории (автомобиль) можно будет получить по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Лещинского, д. 4, к. 349.

● В случае если победителем становится лицо, признанное недееспособным или ограниченно дееспособным, право получения приза переходит к его законным представителям при предъявлении подтверждающих полномочия последних документов.

● В случае если победителем является несовершеннолетний, то при получении приза вместе с Победителем должны присутствовать его законные представители (родители, усыновители, опекуны, попечители) со своим паспортом (видом на жительство, удостоверением беженца) и свидетельством о рождении либо паспортом несовершеннолетнего.

● В случае если Победитель не может получить приз лично, Приз может получить его доверенное лицо по предъявлении своего паспорта (вида на жительство, удостоверения беженца) и доверенности от Победителя, заверенной нотариально.

● Целостность и функциональная пригодность приза должна проверяться участниками непосредственно при его получении. Организаторы не несут ответственности за любые повреждения приза, возникшие после передачи последнего Участнику.

**10. Иное**

Участники Рекламной игры, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Рекламной игры для получения призов.

В Рекламной игре можно принимать участие неограниченное количество раз при условии покупки каждый раз Игрового продукта «1-й "А"», участвующего в Рекламной игре, и выполнения Правил Рекламной игры.

Организатор не несет ответственности за задержку отсылки (доставки) писем по вине третьих лиц. Организатор не несет ответственности за достоверность сведений, указанных в письмах Участниками.

Организатор имеет право снять копию с паспорта Победителей Рекламной игры.

**11. Регламент работы комиссии**

Для контроля за соблюдением официальных правил Рекламной игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрения спорных случаев, принятия решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает комиссию в следующем составе:

<u>Председатель комиссии</u> Максим Анатольевич Журович (с его согласия), менеджер по маркетингу СООО «Ингман мороженое»;

<u>Члены комиссии:</u>

Малышко Галина Геннадьевна, маркетолог ООО «Пиар Квадрат»;

Татьяна Владимировна Алексеенко, индивидуальный предприниматель;

Елена Николаевна Живоглод, специалист по маркетингу ООО «Пиар Квадрат»;

Прудников Александр Васильевич, управляющий ООО «Пиар квадрат», индивидуальный предприниматель.

**12. Особые условия Рекламной игры**

● Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

● Участникам Рекламной игры не может быть выплачен денежный эквивалент стоимости призов.

● Организатор оставляет за собой право произвести экспертизу Упаковок, предъявленных потенциальными Победителями Рекламной игры, для определения их подлинности.

● Упаковки, отправленные в адрес Заинтересованного лица по почте, не обмениваются на призы и не возвращаются Отправителям.

● Факт участия в Рекламной игре означает ознакомление и полное согласие участников с настоящими Правилами Рекламной игры.

● Факт участия в Рекламной игре означает, что ее участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и(или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения участникам.

● Организатор не несет ответственности за качество и оперативность работы почтовой службы.

● Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

● Организатор не несет ответственности за достоверность информации, предоставленной участником Рекламной игры.

● Споры между Организатором и участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

● Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы непосредственно Организатору по адресу: 220004, г. Минск, ул. Амураторская, дом 4Б, пом. 20.

● Официальные правила Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

● Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее 15 сентября 2014 г.

● По вопросам участия в Рекламной игре следует обращаться по телефону: (+375 17) 239-06-56 с 9:00 до 18:00 в рабочие дни с 1 апреля по 15 сентября 2014 г.

Свидетельство №2310 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 27.02.2014 г.
Министерством торговли Республики Беларусь.

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

27 САКАВІКА 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15741)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Таццяна ГАРОШКА: «Я ДЫРЫЖЫРАВАЛА ДРЭВАМІ...»


Надзея Падрэз *(злева)* і Таццяна Гарошка.

**Музыку яна любіла з дзяцінства. Таццяна хоць і атрымала адукацыю па спецыяльнасці «дырыжыраванне», але шляхам класічнага музыканта не пайшла. Стварыла свой гурт «Tanin Jazz», у якім спалучае музыку розных жанраў. Варта зазначыць, што піша дзяўчына не толькі для сябе, але і для іншых артыстаў. Аранжыроўкі, саўндтрэкі да расійскіх фільмаў... Пра ўплыў музыкі на творцу і невыпадковыя сустрэчы ў сваім жыцці Таццяна Гарошка расказала нашаму выданню.**

— Мы цяпер перажываем вельмі цікавы перыяд у творчасці. Паступова змяняецца канцэпцыя музычнага матэрыялу. Мы імкнёмся да якаснага гуку ў клубных залах. Ёсць заданне стварыць новы прадукт, а для гэтага патрабуюцца спецыяльныя ўмовы. У нас за плячыма багата фестывальных і канцэртных выступленняў. Хочацца, каб працяг быў цікавым, без паўтораў. Я даўно саспела зрабіць альбом на беларускай мове. Новая праграма будзе адрозніваца па стылі…

Мне часта шчасціла з аднадумцамі, вось і цяпер праект нібы сам прыцягвае натхнёных таленавітых людзей, здольных не толькі прапаноўваць свае ідэі, але і слухаць адзін аднаго. Супрацоўніцтва з Надзеяй Падрэз якраз прыклад сінтэзу, калі музыка і тэкст яднаюцца так, што ўзнікае адзінства вобраза, агульны сэнс таго, што кожная з нас хоча сказаць. А адзіны настрой — рэч вельмі важная.

**— Што будзе адлюстроўваць новы матэрыял?**

**Таццяна:** З цягам часу я адчуваю сябе больш ураўнаважанай і дараслай, з'яўляюцца новыя мэты, змяняюцца запатрабаванні. Веру, што ўсё невыпадкова, і цяпер у нас можа атрымацца добрая праца. У бліжэйшы час выпусцім тры новыя сінглы. Я ніколі не адчувала сябе такой упэўненай у творчасці. Мабыць, адбіваецца вопыт запісу альбомаў ці пройдзены шлях з мноствам музычных эксперыментаў. Сёння мне спяваць камфортна. Падаецца, усё ідзе так, як мае быць.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Роднае — моднае!

## «КАНВА» ШКОЛЬНАГА БІЗНЕСУ,

### або Што зашыфравана ў арнаменце на ручніку?

**Вышываны сувенір, зроблены ў аграгарадку Петкавічы Дзяржынскага раёна, ёсць ужо нават у Арменіі. Амаль два гады таму ў мясцовай школе стварылі бізнес-кампанію па вырабе рэчаў, аздобленых традыцыйным беларускім арнаментам, і цяпер справа, што трымаецца на дзвюх настаўніцах і дванаццаці вучаніцах, прыносіць навучальнай установе даход. Ці лёгка старадаўняму рамяству «пасябравацаь» з сучаснасцю, як навучыць школьнікаў быць «на ты» з падаткамі і для чаго падлеткам варта ведаць і ўмець тое, чаго не памятаюць і некаторыя бабулі, карэспандэнтам «Чырвонкі» пашчасціла распавесці ў Петкавічах.**

— Гэта хлебасольны, вясельны ручнік. На ім я вышыла сімвалы сям'і, урадлівасці, багацця,— гаворыць **вучаніца Петкавіцкай сярэдняй школы Дзіяна ХРАЛОВІЧ** пра адну са сваіх работ.

Старадаўняя беларуская вышыўка пад назвай «набор», якой удзельнікі бізнес-кампаніі аздобілі ручнікі, сурвэткі і іншыя рэчы,— гэта ўнікальнае рамяство. Вышываныя сувеніры ад юных майстрых — не проста прыгожыя, а яшчэ і з сэнсам. Дзяўчаткі вышываюць так, як гэта рабілі даўней, зашыфроўваючы ў арнаменце на ручніку пажаданні шчасця і дабрабыту. Напрыклад, ромб абазначае засеянае поле, гэта сімвал багацця, а «сняжынка» — сімвал сям'і, маленькія ромбікі-«зярняткі» абазначаюць дзяцей. Ручнік нібы гаворыць таму, каму яго дорыць: хай ваша сям'я жыве ў дастатку і малых паболей нараджаецца.

На стварэнне такога сувеніра Дзіяне патрабуецца каля месяца. Школьніца, дарэчы, толькі вышываннем ручнікоў не абмяжоўваецца. Дзяўчына зрабіла яшчэ і вясельны набор у беларускім стылі. У яго ўваходзяць ручнік, падушачка для пярсцёнкаў, скрынка для падораных грошай, фотаальбом, канверты для падарункаў для гасцей і банбаньеркі.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Фірмовыя сувеніры мясцовай бізнес-кампаніі — закладкі-абярэгі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ідэі маладых

## «ВУЧОНЫ — ГЭТА І МАРКЕТОЛАГ, І МЕНЕДЖАР, І РЭКЛАМШЧЫК»

**Прафесія вучонага за апошнія гады, здаецца, страціла былую прывабнасць, і цяпер не часта можна пачуць ад моладзі пра жаданне стаць даследчыкам. Тым не менш і сёння знаходзяцца людзі, гатовыя прысвяціць навуцы сваё жыццё. Мы пагутарылі з маладым вучоным, стыпендыятам Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі Алегам ІВАНОВЫМ, навуковым супрацоўнікам Інстытута эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук.**


Фота Надзеі БУЖАН.

**— Спадар Алег, раскажыце, як вы зацікавіліся навукай і чаму выбралі менавіта батаніку?**

— Ёсць такі збіты выраз: «Навука — гэта задавальненне ўласнай дапытлівасці за кошт дзяржавы». Ён вельмі ўмоўны, але адначасова і трапны. Калі ў чалавека прысутнічае «жылка» цікаўнасці, то яму апрыёры будзе падабацца нейкая даследчыцкая, навуковая дзейнасць. Усё залежыць толькі ад таго, у якіх умовах гэтая цікаўнасць будзе расці.

Мае бацькі цікавасць свайго сына да прыроды актыўна падтрымлівалі: першую кніжку па біялогіі падарылі яшчэ ў пяцігадовым узросце. Зразумела, што ў гэты час дзеці звычайна цікавяцца больш простымі рэчамі. Я любіў шукаць усялякіх жучкоў, павучкоў, назіраць за імі. Ужо ў школе ў мяне склаліся вельмі добрыя стасункі з выкладчыцай біялогіі Аленай Дзмітрыеўнай Шкут. Яна дазваляла заходзіць у лабаранцкую, а пасля школы нават падарыла мікраскоп. Я аднолькава цікавіўся як біялогіяй, так і хіміяй, а скончылася ўсё тым, што стаў біяхімікам *(смяецца)*.

Пасля школы ўсе раілі паступаць на біяфак БДУ, але я выбраў для сябе педагагічны ўніверсітэт. З трэцяга курса пачаў займацца даследчыцкай работай у галіне эндакрыналогіі. На пятым курсе адзін з выкладчыкаў прапанаваў мне прыйсці сюды, у Інстытут эксперыментальнай батанікі. Я доўга думаў, бо на ўніверсітэцкім узроўні батаніка мне не зусім падабалася, але ў выніку паступіў у аспірантуру пры інстытуце. Мне прапанавалі месца ў лабараторыі, якая вывучае біяхімічныя якасці і ўласцівасці асобных раслін, і ў некаторай ступені мае, скажам так, скіраванасць на медыцыну. Гэтай працай я зараз і займаюся.

**— Фінансавы складнік працы не расхаладжвае?**

— Тут усё, як і ў любым іншым месцы: як працуеш — так зарабляеш. Іншая справа, што бюджэтнае фінансаванне змяншаецца і цяпер складае прыблізна 25 працэнтаў ад агульнага аб'ёму. Усё астатняе інстытут зарабляе сам. Камерцыйнымі распрацоўкамі, грантамі (у тым ліку і бюджэтнымі) і іншымі падобнымі рэчамі. Калі ты на працягу года пабегаеш, пашукаеш сабе праекты і распрацуеш іх, то можна атрымаць вельмі добрыя грошы.

**— Але бегаць і шукаць гранты — занятак, далёкі ад навукі…**

— Безумоўна. Справа ў тым, што вучонаму цяпер мала быць толькі вучоным. Трэба адначасова быць і маркетолагам, і менеджарам, і рэкламшчыкам для самога сябе. Калі ты падаеш нейкі праект на разгляд, то павінен максімальна адаптаваць яго для публікі, каб людзі зразумелі, пра што ідзе размова. Дрэнна, што навукоўцам даводзіцца займацца такой працай, але іншага шляху няма.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
27 03 2014 г.

*У новым фармаце*

# МАЛАДЗЁЖНАЕ TV: А ВЫ ЯШЧЭ НЕ З НАМІ?




**«Студэнтаў адсюль не выгнаць», — смяюцца супрацоўнікі маладзёжнай тэлестудыі БДУІР. Стаць аўтарам роліка, кліпа ці тэлеперадачы можа кожны — таму і ахвотных процьма. Маладзёжнае тэлебачанне БДУІР становіцца заканадаўцам студэнцкай творчасці — пра гэта сведчаць прэміі за лепшыя відэаролікі, актыўныя абмеркаванні на інтэрнэт-форумах, спробы іншых ВНУ «паўтарыць» творы «тэхнікаў». Дык што гэта — хваля аматарскай самадзейнасці ці сур'ёзныя творчыя пошукі студэнтаў? Праверым на справе.**


Карэспандэнт Алена Сакалоўская.

## Перайманне — лепшы піяр

Пра тэлевізіёншчыкаў з БДУІР ведаюць не толькі ў сценах роднай альма-матар: сюжэты студэнтаў маюць доўгія «хвасты» з каментарыяў на форумах. Колькасць праглядаў на інтэрнэт-канале розная — ад сотні да некалькіх тысяч. На словах Алены Сакалоўскай, прэс-сакратара БДУІР, лічбы даюць магчымасць высветліць — што цікава гледачам, а што не. «Мы цудоўна разумеем свае хібы і недапрацоўкі, але стараемся адпавядаць узроўню сапраўднага СМІ, — кажа Алена. — Нашы журналісты, аператары, мантажоры — звычайныя студэнты, якія вучацца на ўласным вопыце. Спецыяльнай адукацыі ў іх няма».

Студэнцкае тэлебачанне БДУІР шмат у каго на слыху — людзі гавораць, абмяркоўваць, крытыкуюць. «Нас заўважаюць і нават раўняюцца на нас, — адзначае Вячаслаў Праташчык, адказны за фота і аптымізацыю тэлепрацэсу. — Асабліва калі наш канал «выбухнуў» навагоднім кліпам (ён, дарэчы, сабраў больш за 6 тысяч праглядаў!). Пачаліся спробы перайманні, напрыклад, у БДПУ зрабілі відэаролік «Адказ БДУІР». Мы такога не чакалі! Затое даведаліся пра калег, бо сувязяў з іншымі студэнцкімі студыямі амаль не падтрымліваем. Выключэнне складае толькі тэлецэнтр БДУ, з якім наладжана супрацоўніцтва. Калі нам патрэбна абсталяванне, яны заўжды працягваюць руку дапамогі. Мы, у сваю чаргу, таксама з радасцю выручаем калег». Атрымліваецца, што БДУІР дыктуе сваю моду на студэнцкае тэлебачанне. Але не будзем ідэалізаваць студэнцкую студыю — маладой камандзе ёсць куды рухацца і над чым працаваць.

## Было б дзе развярнуцца!

Гэта сёння ва ўсіх карпусах БДУІР вісяць «плазмы». А пачыналася студэнцкае тэлебачанне... з відэамагнітафона, камеры і групкі энтузіястаў.

**Наш канал «выбухнуў» навагоднім кліпам (ён, дарэчы, сабраў больш за 6 тысяч праглядаў!). Пачаліся спробы перайманні, напрыклад, у БДПУ зрабілі відэаролік «Адказ БДУІР».**

— Студэнцкая відэастудыя БДУІР адлічвае сваю гісторыю з 2001 года, калі нарадзілася першая віншавальная праграма, — распавядае Максім Максак, «старажыл» відэастудыі і па сумяшчальніцтве кіруючы інжынер. — Хлопцы шукалі аператара, а я яшчэ ў школе быў з відэакамерай на «кароткай назе». Так і пачалося. Відэамагнітафоны, пасля — першая відэастанцыя для мантажу, пульт, мікрафоны, фотаапараты. Цяпер відэастудыя БДУІР — гэта цэлае падраздзяленне прэс-службы ўніверсітэта. Поле дзейнасці — жыццё навучальнай установы ў поўным аб'ёме: ад уручэння медаля лепшаму студэнту да рэспубліканскіх спаборніцтваў. Зараз у студыі тры напрамкі — гэта відэа, фота і мультымедыя. Калі ёсць патрэба зрабіць прома-матэрыялы для ўніверсітэта, каманда робіць і прэзентацыі, і фотакалажы.

Пяць гадоў таму Вячаслаў Праташчык прыйшоў на студыю інжынерам па размеркаванні. За гэты час малады спецыяліст пасябраваў з фотакамерай, але цяпер перадаў фотасправу ў рукі маладых — няхай практыкуюцца. «Я займаюся тэхнічнай аптымізацыяй працэсу, што тут адбываецца, — распавядае пра сваю работу Вячаслаў. — Усім — і выкладчыкам, і студэнтам — патрэбен доступ да нашай інфармацыі. У маіх планах — стварэнне адзінага медыяцэнтра, дзе будуць захоўвацца ўсе матэрыялы: і фота, і відэа. З апошніх дасягненняў варта ўзгадаць цэнтралізаванае кіраванне сеткай. Цяпер не трэба бегаць у іншы корпус, каб падключыць вяшчанне — усё робіцца тут, у студыі».

Крок за крокам тэхнічныя пытанні вырашаюцца. Аднак памяшканні тэлестудыі ўжо загрувашчаны тэхнікай — разярнуцца ўсёй камандзе, ды яшчэ і з абсталяваннем, вельмі складана. «Каб рухацца далей, патрабуецца больш месца, — уздыхае Вячаслаў. — Калі я прыйшоў на студыю, у гэтым пакоі стаяў толькі стол. А цяпер ёсць камп'ютары, мікрафоны, а для карэспандэнта месца няма». Відэастудыя расце як на дражджах!


У лабараторыі мантажу гаспадарыць Вячаслаў Праташчык.

## Навіны — прадукт лёгкі

З прыходам на студэнцкае тэлебачанне мінулай восенню журналісткі Алены Сакалоўскай на «СтудTV» пачаліся вялікія перамены. Адказная за творчую частку праекта, яна вырашыла перайграць усё па-іншаму. Праўду кажучы, што новая мятла па-новаму мяце. «Мне захацелася паказаць, што «тэхнары» нічым не горшыя за журналістаў, — запэўнівае Алена. — Першая «рэформа» закранула самае дарагое — канцэпцыю: студэнцкае тэлебачанне стала маладзёжным. Хіба гэта не адно і тое ж? Алена прызнаецца: «Хочацца, каб не толькі студэнты адчувалі сябе часткай нашага тэлебачання. Ёсць яшчэ і аспіранты, і магістранты, маладыя выкладчыкі, з якімі мы цяпер актыўна супрацоўнічаем — задзейнічаем у роліках і арыентуемся як на аўдыторыю гледачоў».


Максім Максак вучыць студэнта Івана Андрушкевіча аператарскаму майстэрству.

Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

Другая рэформа прыйшлася па фармаце выпускаў — каманда зрабіла стаўку на кароткія інфармацыйныя жанры: ролікі, кліпы. Доўгія інфармацыйныя выпускі навін канулі ў Лету нездарма: каму хочацца праглядаць падзеі мінулых тыдняў?

«Цяпер мы сталі больш аператыўнымі, — не без радасці заўважае Максім Максак. — Учарашняя падзея транслюецца ўжо сёння альбо заўтра. А раней працэс складання перадачы зацягваўся да месяца: кожны тыдзень запісвалася некалькі сюжэтаў, затым гэтыя кавалачкі склейваліся ў адзін вялікі выпуск».

Новаўвядзенні, безумоўна, маюць плён: сюжэты, размешчаныя на ююбаўскім канале, маюць даволі шмат праглядаў, а таксама на сайце БДУІР. Значыць, зваротная сувязь знойдзена! «Мы хочам быць роўнымі з іншымі СМІ, не жадаем адставаць. Увесь час шукаем што дапрацаваць, зрабіць больш якасна. Адным словам, расцём», — прызнаецца Алена Сакалоўская.

## Сціплым тут не месца!

Студэнтаў хлебам не кармі — дай папрацаваць на студыі. Тым не менш — нягледзячы на тое, што студэнтаў тут прымаюць, чакаюць, даюць магчымасць заняцца справай — ідзе адбор.

«Я прыходжу да высновы, што мне патрэбны толькі лепшыя, моцныя, самыя творчыя, — дзеліцца думкамі Алена Сакалоўская. — Мы, у сваю чаргу, гатовыя аддаваць сябе, ахвяраваць сваім часам, каб навучыць таму, што ўмеем самі».

«Сапраўды, студэнтаў прыходзіць вельмі шмат, — дадае Вячаслаў. — Але застаюцца працаваць некалькі чалавек. Бывае, прыходзіць юнак і кажа: «Хачу здымаць». А калі адправіш яго на «заданне», нічога не атрымліваецца... Альбо студэнты проста лянуюцца. Затое тыя, што застаюцца — людзі «ідэйныя».

Адным з такіх «ідэйных» з'яўляецца другакурснік Іван Андрушкевіч. Хлопец адкрыў для сябе свет тэлебачання выпадкова. «Убачыў рэкламныя банеры відэастудыі, маляў, патрабуюцца аператары, карэспандэнты. Прыйшоў, спадабалася — і я застаўся тут, у цудоўнай камандзе прафесіяналаў. Мае аднакурснікі падпрацоўваюць, а для мяне магчымасць творчага росту важнейшая за грошы. Вучобе маё хобі не перашкаджае. Выкладчыкі, безумоўна, ведаюць, што я займаюся на відэастудыі, але глядзяць на такое бавленне часу з прыхільнасцю». Алена выдае сакрэт сціплага студэнта: Іван Андрушкевіч паспявае і падпрацоўваць, і вучыцца на «выдатна».

А для некаторых студэнтаў занятκі на ўніверсітэцкім тэлебачанні перараслі ў прафесію. Віталь Наркевіч, Віктар Шумскі — былыя актывісты студэнцкага тэлебачання — пайшлі працаваць на прафесіянальнае тэлебачанне. Сяргей Казловіч — студэнт чацвёртага курса, аднак ужо працуе відэаінжынерам на АНТ. Здавалася б, звычайнае захапленне...

«За нас усё скажуць нашы работы», — усміхаюцца супрацоўнікі маладзёжнага тэлебачання, і ім верыш. Цудоўна, калі ва ўніверсітэце разумеюць важнасць уласнай студыі... Поспеху і росту журналістам-аматарам з БДУІР!

**Кацярына РАДЗЮК.**

*Акцыя*

# НА АДНОЙ МОВЕ

**Акцыя «Беларусь — краіна міру і згоды» прайшла ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны. Як расказала другі сакратар Гомельскага абласнога камітэта БРСМ Таццяна Сельвіч, у Год гасціннасці мэтай мерапрыемства было нагадаць, што Беларусь — міралюбная краіна, у якой рады бачыць іншаземцаў у якасці студэнтаў.**

На сустрэчу былі запрошаны замежныя студэнты, якія вучацца ва ўсіх ВНУ абласнога цэнтра — па 40 чалавек ад кожнай. Лідары грамадскіх аб'яднанняў, у прыватнасці, абласнога камітэта БРСМ і абласнога аддзялення Фонду Міру, расказалі пра асноўныя кірункі сваёй дзейнасці і запрасілі да дыялогу маладых людзей. Дарэчы, сёння ў ВНУ Гомельшчыны вучыцца больш за тысячу замежных грамадзян з дваццаці краін свету.

Прадстаўнікі ад кожнай ВНУ — студэнты з Нігерыі, Туркменістана, Індыі, Кітая, Таджыкістана, Японіі і іншых краін — прадставілі «візітныя карткі» сваёй дзяржавы і расказалі, чаму яны выбралі для атрымання адукацыі вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі. Напрыклад, кітаянка Пань Хуанжань, якая вывучае мовы на філалагічным факультэце ўніверсітэта імя Скарыны, прызналася, што вельмі любіць нашу краіну. Яе выступленне было такім яскравым і эмацыянальным, што зала выбухнула апладысментамі. Акрамя таго, студэнты прадэманстравалі свае творчыя здольнасці ў танцах, вакале і ігры на народных інструментах.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*Класныя навіны*

# Навуковыя веды можна будзе... памацаць

**Першы ў Беларусі інтэрактыўны цэнтр навукі і тэхналогій адкрыецца ў наступным годзе ў Гродне. Напрыканцы 2013 года Гродзенская абласная навуковая бібліятэка і Публічная бібліятэка імя Марыі Канапніцкай у Сувалках распачалі рэалізацыю праекта «Мультыцэнтр».**

90% праекта фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Агульны кошт праекта складае 1118602,37 еўра.

У рамках праекта ў Гродне (Беларусь) і Сувалках (Польшча) будуць створаны мультымедыйныя вучэбныя цэнтры, абсталяваныя самымі сучаснымі электроннымі сродкамі. Адукацыйнымі праграмамі «Мультыцэнтра» змогуць скарыстацца ўсе ўзроставыя і сацыяльныя групы, у тым ліку людзі з фізічнымі і разумовымі недахопамі.

Тэматычныя заняткі, прысвечаныя розным галінам ведаў, будуць праходзіць з выкарыстаннем спецыяльных праграм і сучасных тэхналогій. Для прыкладу, з дапамогай электратэхнічных прыстасаванняў школьнікі змогуць зразумець дзеянне сонечнай, цеплавой і воднай энергіі. У раздзеле «мастацтва» ўсе ахвотныя змогуць даведацца пра сакрэты стварэння фільмаў і мультфільмаў. У мультыцэнтры будуць арганізаваны міні-студыя гуказапісу і інтэрактыўны цэнтр вывучэння замежных моў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**АД РЭДАКЦЫІ**

**Гэтыя два артыкулы сышліся на паласе па волі выпадку. Нашы няштатныя аўтары — гімназістка Арына і студэнтка Ганна — ведаюць адна адну хіба толькі па публікацыях на старонках «Чырвонкі». Дзяўчаты паасобку і кожная па сваіх прычынах вырашылі ўзяцца за адну і тую ж тэму, якая іх «зачапіла» — прэстыж прафесіі настаўніка, стаўленне да гэтай працы ў грамадстве. Пачытаем, паразважаем разам з аўтарамі?..**

*Раз і назаўсёды*

# ЯНА ВУЧЫЛА ДЗЯЦЕЙ НЕ ТОЛЬКІ МАТЭМАТЫЦЫ

**...Я сяджу ва ўтульным крэсле і п'ю каву. Побач са мной мая бабуля Зоя. З ёй можна пагаварыць пра ўсё на свеце, я ведаю, што яна заўсёды дасць добрую параду, ніколі мяне не папракне і не асудзіць. Яна — чалавек, якому я цалкам давяраю.**

Сёння тэмай для гутаркі стаў выбар маёй будучай прафесіі. Дзясяты клас — якніяк, пара ўжо вызначацца. Па парадзе бацькоў і бабулі я выбрала клас з паглыбленым вывучэннем фізікі і матэматыкі. А як жа інакш? У бацькоў тэхнічная адукацыя, а бабуля — заслужаны педагог, усё жыццё адпрацавала настаўніцай матэматыкі.

Напэўна, цяжка быць выкладчыкам. Я заўсёды дзівілася іх проста неверагоднай цярплівасці і вытрымцы! Правяраючы на начах нашы сшыткі, устаючы раней, каб падрыхтавацца да ўроку, штораніцы яны, як па ўзмаху чароўнай палачкі, паўстаюць перад намі ў ідэальна адпрасаваных касцюмах і з усмешкай на твары. Шкада, што многія так часта недаацэньваюць іх працу. «Эх, а раней восЬ зусім іначай было», — распавядае бабуля.

А як гэта — іначай?

## Запомніліся першая і трэцяя

Зоя Іванаўна Крыштафовіч нарадзілася ў вёсцы Копцевічы Чашніцкага раёна. Першыя веды атрымала ў невялікай сельскай школе (у класах было ўсяго па 6-8 вучняў). Дзяўчынцы адразу не спадабаліся ўрокі гісторыі і малявання, затое матэматыку, англійскую мову і фізкультуру чакала з нецярплівасцю.

Схільнасці да дакладных навук выявіліся адразу ж. У школьніцы заўсёды былі добрыя адзнакі па матэматыцы і фізіцы. Шмат у чым цікавасць да прадмета залежыць ад настаўніка, ад яго манеры выкладання і зацікаўленасці ў поспехах вучняў. У Зоі было некалькі настаўніц матэматыкі. Больш за ўсё ёй запомніліся першая і трэцяя. Першая — Ганна Фёдараўна Ражко, жанчына даволі строгая, якая не ставіла «пяцёрку», калі вучань не адказваў на пытанне павышанай складанасці. А трэцяя — Вера Паўлаўна Асюкевіч — разгледзела патэнцыял у сваёй вучаніцы, пры ёй Зоя пачала хадзіць у матэматычны гурток.

Калі ў старэйшых класах паўстала пытанне пра выбар прафесіі, сумненняў у Зоі не было. «Мы не ведалі ні пра якія інжынерныя прафесіі, — распавядае бабуля. — Бацькі хацелі, каб я стала доктаркай. Не сказаць, каб я тады вельмі марыла стаць настаўніцай... Усе дзеці гуляюць у «краму», «бальніцу», а мне заўсёды падабалася роля строгай выкладчыцы, ды і схільнасці да матэматыкі ў мяне былі». Вучыцца Зоі было няцяжка. Яна рабіла поспехі ў вучобе, і таму на 3 і 4 курсах атрымлівала павышаную стыпендыю. Вучоба вучобай, але ў студэнткі яшчэ заставаўся страх перад работай з дзецьмі. «Памятаю, усе хацелі пазбегнуць педагагічнай практыкі, таму пры наборы ў будатрад у піянерскі лагер нават быў конкурс», — смяецца бабуля.

## Вось такія Пірагі...

Пасля заканчэння універсітэта маладую настаўніцу адправілі ў вёску Пірагі. Там ёй далі весці не толькі матэматыку, але і ўрокі чарчэння, якое яна ніколі не любіла. Для маладога спецыяліста гэта было нечакана і аказалася непасільнай ношай, таму, адпрацаваўшы два тыдні, Зоя звольнілася. Пасля гэтага было яшчэ некалькі школ, але даўжэй усяго (ні многа ні мала — 39 гадоў з 42-х агульнага стажу!) яна адпрацавала ў школе №1 горада Верхнядзвінска.

**Настаўнік павінен быць цярплівым і ў той жа час настойлівым. І строгім, і добрым адначасова, але самае галоўнае — любіць дзяцей. У гэтай працы самае цяжкае — гэта калі дзеці цябе не разумеюць ці проста не жадаюць разумець.**

Свой першы ўрок у новай якасці — настаўніцы матэматыкі — Зоя Іванаўна памятае вельмі добра. Гэта было падчас практыкі ў адной з віцебскіх школ. Тады ёй трэба было правесці ўрок у 7 класе. Ёй далі план урока, і яна цэлы дзень рыхтавалася. «Я хадзіла па калідоры і ўвесь час паўтарала: «Добры дзень, дзеці, садзіцеся, дзеці», — распавядае бабуля. І вось надышоў гэты дзень. Яна праверыла хатняе заданне, вучні хутка рашылі ўсе запланаваныя задачы, а што рабіць далей, Зоя не ведала. Цяпер яна б адразу прыдумала, як заняць дзяцей, але тады нічога зрабіць не змагла. Студэнтка проста была ў шоку.

## Вітаюцца амаль усе!

Усіх сваіх вучняў за гэтыя доўгія 42 гады Зоя Іванаўна, вядома, не памятае: яна вучыла столькі! А вось яе памятаюць. У гэтым я пераконваюся кожны раз, калі ў родным бабуліным горадзе іду з ёй па вуліцы, і з намі вітаюцца ледзь не ўсе мінакі: былыя вучні, іх бацькі, калегі-выкладчыкі. Але ёсць і тыя, каго бабуля памятае дагэтуль. Яна мне распавяла пра хлопчыка, Алега Падкулдзіна, маладзейшага за ўсіх сваіх аднакласнікаў, але, нягледзячы на розніцу ва ўзросце, вельмі здольнага. Спачатку настаўніца лічыла яго двоечнікам і гультаём, крыўдзілася на яго, бо ён увесь час ляжаў на парце, але потым высветлілася, што ў дзіцяці проста праблемы са зрокам. Скончыўшы школу, хлопец паступіў у МДУ на эканамічны факультэт. «Адзін з лепшых маіх вучняў, — заўважае бабуля. — Наогул, я на сваім досведзе пераканалася, што схільнасць да дакладных навук у хлопчыкаў большая, чым у дзяўчатак».

Настаўніца з Зоі ўсё ж выйшла не вельмі строгая. Бабуля па сваім характары была і застаецца добрай, цярплівай і мяккай. А вось такой якасцю, як справядлівасць, яна, безумоўна, валодала. Гэта заўважалі і калегі, і вучні.

## Як прыемна бачыць цягу да вучобы!

Зоя Іванаўна заўсёды імкнулася знайсці падыход да кожнага дзіцяці, і гэта ў яе добра атрымлівалася.

Пра выбар прафесіі заслужаны педагог ніколі не шкадавала. Яна і ўявіць сябе не магла ў іншай ролі, без праверак сшыткаў па начах, без стаяння каля дошкі з указкай. Калі я спытала ў яе, якімі якасцямі павінен валодаць настаўнік, вось што яна мне адказала: «Настаўнік павінен быць цярплівым і ў той жа час настойлівым. І строгім, і добрым адначасова, але самае галоўнае — любіць дзяцей. У гэтай працы самае цяжкае — гэта калі дзеці цябе не разумеюць ці проста не жадаюць разумець. Але як жа прыемна бачыць поспехі сваіх вучняў! У апошнія гады я выкладала ў Бігосаўскай школе. Уставала а 5 гадзіне раніцы, каб паспець на цягнік, але на ўроках бачыла вочы гэтых дзяцей, якія хацелі ведаць, хацелі вучыцца. Пазней, праз два гады, калі я іх ізноў убачыла, яны падбягалі да мяне са словамі падзякі. Гэта дарагога варта».

Ёсць у бабулі і вучні, якія самі сталі настаўнікамі матэматыкі. Адной з такіх вучаніц бабуля асабліва ганарыцца. Гэта Ала Міхайлаўна Лукашонак, яна працуе ў школе, піша ў газеты па педагагічную тэматыку, распрацавала сваю методыку навучання. Бабуля вельмі радавалася пра тое, што гэта яе вучаніца.

## Галоўная ўзнагарода

Зоя Іванаўна змагла рэалізаваць сябе як у прафесіі, так і ў асабістым жыцці. Яна выхавала дзвюх дачок, стала самай лепшай і любімай бабуляй для дзвюх унучак. Мая бабуля — звычайны чалавек, яна не лятала ў космас, не здымалася ў кіно, але яе заслуга перад грамадствам — неацэнная. Шкада, што цяпер усё больш пішуць пра акцёраў і спевакоў, а такія людзі, як мая бабуля і многія іншыя, застаюцца ў цені. Іх праца не вельмі часта ўзнагароджваецца матэрыяльна. Тым не менш галоўная ўзнагарода для настаўніка — разумныя і высокамаральныя людзі вакол, тыя, з якімі мы сустыкаемся кожны дзень.

**Арына КАГАЛЁНАК,**
**вучаніца 10 класа гімназіі № 2 г. Наваполацка.**

*Пераемнасць*

# ЗНАЁМЦЕСЯ: НАСТАЎНІКІ БУДУЧЫНІ!

**Безумоўна, настаўнік — прафесія важная. Але апошнім часам прэстыж гэтай прафесіі падае, а мы працягваем рабіць выгляд, нібы ўсё ідзе так, як трэба.**

Многія педагогі любяць вучыць дзяцей і хацелі б застацца ў школе, але не кожны хоча атрымліваць за гэта тыя грошы, якія прыходзяць на пластыкавую картку кожны месяц. У прынцыпе, прычына, чаму большасці студэнтаў не падабаецца перспектыва быць настаўнікам, і так для ўсіх відавочная — не вельмі прыемная будучыня ў выглядзе вялікіх нервовых затрат і невялікага заробку...

Нядаўна ў мяне з'явіўся агеньчык надзеі: ёсць яшчэ тыя, у кім жыве жаданне вучыць бескарысліва! Спачатку я пазнаёмілася з адной такой дзяўчынай, а цяпер сустракаю ўсё больш студэнтаў, якія насамрэч чакаюць практыку ў школах, а не хаваюцца ад яе. Шэраг знаёмстваў з будучымі настаўнікамі пачаўся недзе гады два таму: я сустрэла дзяўчыну, якая мэтанакіравана пайшла на алімпіяду па рускай мове, каб паступіць на філалагічны факультэт БДУ і, скончыўшы яго, стаць настаўніцай.

**Магчыма, да таго моманту, як яны атрымаюць дыпломы і прыйдуць на працу ў навучальныя ўстановы, грамадства абудзіцца і зразумее, што прафесія педагога — гэта не «крыж»?**

Тады гэтая дзяўчына пераканала мяне, што ёсць у нас людзі, гатовыя стаць добрымі настаўнікамі — насуперак папяровай бюракратыі і незайздроснаму заробку. У наступныя гады я таксама сустракала дзяўчат, якія былі не супраць працаваць настаўніцамі ў сваіх навучальных установах. Дарэчы, ведаеце, які прадмет моладзь хацела б весці ў малодшых пакаленняў найперш? Беларускую літаратуру! Як лічаць студэнты, менавіта любоў да яе трэба прывіваць у першую чаргу. А яшчэ многія цяперашнія настаўнікі, якія працуюць у школе, на думку моладзі, расказваюць часам зусім не тое, што можа зацікавіць юныя розумы. Ды і ў нашай літаратуры, асабліва сучаснай, ёсць вартыя ўвагі асобы і творы, якія застаюцца па-за праграмай.

...На аддзяленні рускай філалогіі ў БДУ зараз вучыцца Настасся Буракоўская. «Настаўніцай я захацела стаць толькі паўтара года таму, а да гэтага шукала такую прафесію, у якой я магла б спалучаць любоў да творчасці і зносіны з рознымі людзьмі», — расказвае Насця. І толькі перад цэнтралізаваным тэсціраваннем дзяўчына зразумела, што педагог у такім выпадку — выдатны варыянт. На Насціну думку, калі ты — настаўнік, то павінен прачынацца з жаданнем ісці на працу, а гэта і ёсць галоўнае пры выбары прафесіі. Насця таксама адкрыла сакрэт, што будзе імкнуцца да вобразу сваёй настаўніцы рускай мовы і літаратуры: яна вельмі падабалася дзяўчыне ў школе.

Вядома, настаўнік — гэта не проста нянька, якая даглядае дзяцей 45 хвілін урока. Насця гэта разумее і кажа, што галоўная мэта для яе — адкрыць вучням усё багацце кнігі. Як лічыць дзяўчына, сёння дзяцей немагчыма ўтрымаць за чытаннем, і яны не разумеюць, як шмат губляюць праз гэта.

Крыху іншую мэту ставіць для сябе будучая выкладчыца гісторыі Юлія Аляксеенка, якая ў дзяцінстве паглядзела добрую савецкую стужку «Вялікі перапынак». Менавіта з яе, кажа Юля, і пачала фарміравацца ідэя стаць настаўніцай. Вялікі ўплыў на далейшы выбар, на думку дзяўчыны, аказваюць менавіта школьныя настаўнікі. Юлі пашанцавала з добрымі настаўнікамі, а апошнім штуршком да важнага рашэння стаў калектыў выкладчыкаў Ліцэя БДУ. Дарэчы, Юля дасылае прывітанне свайму настаўніку грамадазнаўства, які адыграў асаблівую ролю ў выбары прафесіі.

...Ёсць і тыя, хто прыйшоў да свайго прызвання раптам, выпадкова. Напрыклад, Караліна Комар зразумела, што хоча настаўнічаць толькі пасля таго, як трапіла на факультэт філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Цяпер дзяўчына ўпэўнена: толькі ў ролі настаўніцы яна зможа рэалізавацца на 100 працэнтаў. Дарэчы, Караліна — адзіная, хто пракаментаваў такую неадназначную рэч, як сённяшні заробак настаўніка. Яго велічыня дзяўчыну не хвалюе, бо яна пераканана, што аддача ад працы з дзецьмі, абуджэнне ў іх прагі дзейнасці — куды больш істотныя рэчы.

Пошук апантаных ідэяй настаўніцтва прывёў мяне да Караліны Кукрэш (дарэчы, будучай выкладчыцы геаграфіі), якая захацела стаць настаўніцай у школе дзякуючы дню самакіравання. Праводзячы заняткі ў малодшых класах, дзяўчына бачыла зацікаўленасць у вачах дзяцей. Працэс пошуку цікавай інфармацыі і адказы на пытанні так зацягнулі Караліну, што не адпусцілі і да гэтага часу.

...Пакуль дзяўчаты яшчэ вучацца ва ўніверсітэце. Магчыма, да таго моманту, як яны атрымаюць дыпломы і прыйдуць на працу ў навучальныя ўстановы, грамадства абудзіцца і зразумее, што прафесія педагога — гэта не «крыж»? Калі чалавек верыць у сваю мару і імкнецца да яе ўвасаблення, то нічога не павінна яго спыніць.

**Ганна ПЯРОВА,**
**студэнтка І курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Колькі характараў — столькі лёсаў, столькі сцяжынак вядуць у будучыню. Калісьці, азіраючыся на мінулае, кожны абавязкова будзе бачыць у пачатку ўсіх дарог свайго першага настаўніка. Гэтыя хлопчыкі і дзяўчаткі з пасёлка Міханавічы Мінскага раёна будуць памятаць яе — сваю першую настаўніцу, Ганну Іванаўну Міхаленю.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
27 03 2014 г.

# «КАНВА» ШКОЛЬНАГА БІЗНЕСУ



Старадаўняя беларуская вышыўка цікавіць і сучасных падлеткаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Калі б удалося пабачыць гэтыя рэчы без іх аўтаркі, адразу б і ў галаву не прыйшло, што зрабіла іх сучасная школьніца. Але гэта сапраўды так. І вышываць Дзіяну і яе сябровак навучылі не бабулі ці матулі, а настаўніцы.

— Калі раённы аддзел адукацыі звярнуўся да нас з просьбай стварыць школьную бізнес-кампанію, мы пачалі думаць, які напрамак абраць. Яшчэ да гэтага ўсе госці, што наведвалі нашу школу, не з'язджалі без невялічкага падарунка — «карпаратыўнай» вышытай закладкі. Вучні рабілі іх на ўроках працы. Таму вырашылі заняцца менавіта вышываннем і стварэннем сувенірнай прадукцыі і пачалі распрацоўваць асартымент, — успамінае **намесніца дырэктара па выхаваўчай рабоце, куратар адміністрацыі бізнес-кампаніі, настаўніца абслуговай працы Валянціна Іванаўна РАБІНОЎСКАЯ.**

Вёска Петкавічы дастаткова маладая, і майстрых, якія маглі б навучыць старадаўняй вышыўцы, тут няма. Таму Валянціна Іванаўна разам са сваёй калегай, **настаўніцай матэматыкі і кіраўніцай школьнай бізнес-кампаніі Галінай Іванаўнай ЦЭЛАГУЗ,** спасцігалі ўсё самі, карыстаючыся самымі рознымі крыніцамі інфармацыі. Яшчэ да стварэння бізнес-кампаніі настаўніцы вялі гурткі па рукадзеллі. Тых, хто лічыць, што матэматыку і творчасць сумясціць цяжка, Галіна Іванаўна на сваім прыкладзе можа лёгка пераканаць у памылковасці такой думкі.

— Я сама шыла сабе вясельную сукенку, люблю вязаць, умею ткаць на старадаўнім станку і, зразумела, вышываць. У той жа час і матэматыка для мяне — адна з самых любімых спраў. Мне заўжды было цікава разабрацца са складанай задачай. Муж нават часам забіраў кніжку і сшытак. Маўляў, няўжо табе ў школе навукі не хапае, хоць дома ўжо адпачні. Так што ў маім выпадку матэматыка і рукадзелле дапаўняюць адно адное, — кажа настаўніца.

Той, хто хоць раз спрабаваў вышываць, цудоўна зразумее ее словы. Нават звычайныя крыжыкі патрабуюць уважлівага ліку, а калі працаваць з наборам, тут увогуле без добра структураванага мыслення не абысціся. Адступленне ад правільнага ўзору хоць на міліметр пагражае сапсаваць усю работу.

Але калі ўсё зроблена ідэальна, атрымліваюцца цудоўныя рэчы. Людзі нават часам не разумеюць, што бачаць перад сабой вышыўку, пытаюцца, на якім станку гэта выткалі.

Цяпер у школьнай «майстэрні» ў Петкавічах можна замовіць ручнікі, сурвэткі, закладкі-абярэгі, бірулькі, канверты для грошай, з якімі звычайна ідуць госці на вяселле, чахлы для мабільных тэлефонаў, вокладкі для кніг і вясельных альбомаў і іншыя рэчы такога кшталту.

Калі ж вучаніцы паспяваюць і заняткі наведваць, і вышыўкай займацца? Часцей за ўсё дзяўчаты бяруць працу дадому і вышываюць у свой вольны час. У школе існуе факультатыў «Асновы прадпрымальніцкай дзейнасці». Але на ім не да творчасці — там больш займаюцца бізнес-планамі і рознымі арганізацыйнымі момантамі, якія датычаць бізнес-кампаніі. Таксама дзяўчаты-майстрыхі наведваюць гурток, на якім распрацоўваюць схемы вышыўкі і мадэлі прадукцыі.

Зусім аб'ёмам працы спраўляюцца 12 чалавек, задзейнічаных у бізнес-кампаніі, але вышываць вучацца многія. Справа ў тым, што «бізнесоўцам» можна стаць толькі калі табе споўнілася 14 гадоў. Малодшыя ж могуць наведваць гурток і вучыцца вышываць, каб у будучыні далучыцца да вытворчасці сувеніраў.

— Дзеці вельмі зацікаўлены ў гэтым, — кажа Галіна Іванаўна. — Яны не проста наведваюць гурток па інтарэсах, а маюць магчымасць зарабіць свае першыя грошы, няхай і не надта вялікія. Вельмі добра, што ўжо ў падлеткавым узросце нашы вучаніцы разумеюць значэнне заробку. Так, нашы дзяўчаты без праблем могуць падлічыць аб'ём зробленай за месяц працы, адняць падаходны падатак і такім чынам даведацца суму сваёй зарплаты.



Валянціна Іванаўна РАБІНОЎСКАЯ распавядае сваім вучаніцам пра тонкасці стварэння скарбонкі.

Фота здымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Тут усё сур'ёзна. Юныя майстрыхі ведаюць, што ў бізнес-кампаніі ёсць свой касавы апарат і афіцыйная рэгістрацыя ў падатковай інспекцыі.

Нягледзячы на досыць прагматычны падыход да справы, кошты ў петкавіцкай «сувеніркі» дэмакратычныя: закладкі-абярэгі каштуюць 15 тысяч рублёў, канверты для дарэння — 30 тысяч, маленькі ручнік на ікону — 150 тысяч, а вялікі ручнік — 300 тысяч рублёў. Дзеці за сваю працу атрымліваюць прыкладна трэць ад кошту. Прадукцыю можна не толькі набыць, але і ўзяць напракат. Заплаціць давядзецца 70 працэнтаў той сумы, у якую ацэньваецца рэч. Попыт заўсёды ёсць. Рэкламаваць сваю прадукцыю бізнес-кампаніі дазволена на сайце школы, прадаваць сувеніры дапамагае і «сарафаннае радыё»: знаёмыя, сябры і калегі. Пакупнікі, якія ўжо маюць дома «прадукт» ад школьнай бізнес-кампаніі, таксама часта рэкамендуюць яе паслугі. За мінулы год школьная бізнес-кампанія атрымала даход каля 7 мільёнаў рублёў. А з пачатку гэтага года ў Петкавічах ужо паспелі зарабіць чатыры мільёны рублёў. Першапачатковыя капіталаўкладанні ў школьны бізнес былі невялікімі. Спатрэбілася набыць толькі спецыяльную тканіну — канву, якая ёсць у любым буйным універмагу, і ніткі для вышывання.

У Петкавічах упэўнены: для таго, каб паспяхова развіваць бізнес, трэба ўмець адаптаваць старадаўняе рамяство да сучаснасці і ўвесь час сачыць, што сёння карыстаецца асаблівай папулярнасцю.

— Мы хацелі б знайсці магчымасць прадаваць сваю прадукцыю падчас чэмпіянату свету па хакеі, — дзеляцца планамі Валянціна Іванаўна і Галіна Іванаўна. — Напрыклад, можна было б вышыць абярэгі з імёнамі вядомых хакеістаў. Замежным балельшчыкам павінна спадабацца.

Прыгажосць петкавіцкіх вырабаў замежнікі, дарэчы, ужо ацанілі. Аднойчы ў школу прыехалі госці з Расіі. На той момант лішніх гатовых ручнікоў у школе не аказалася, былі толькі тыя, што захоўваюцца як узоры. Але расіяне такое тлумачэнне не прынялі і доўга ўпрошвалі прадаць ім беларускі сувенір. Іх вельмі ўразіла, што такую карпатлівую ручную працу асвоілі дзеці, і беларускія традыцыі не спыняюцца выключна на бабулях і дзядулях. Ёсць вышываны падарунак з Петкавіч і ў міністра адукацыі Арменіі, які атрымаў яго падчас свайго візіту ў Мінскую вобласць.

Галіна Іванаўна і Валянціна Іванаўна ўпэўнены: адзінага сакрэту поспеху ў школьнай бізнес-кампаніі няма. Тут трэба і ўгадаць з відам дзейнасці, і зацікавіць дзяцей, і самому быць захопленым гэтай справай. А што датычыць дзяўчат, якія ўдзельнічаюць у бізнес-кампаніі, то





Дзіяна ХРАЛОВІЧ сама зрабіла вясельны набор у беларускім стылі.

яны, нягледзячы на ўзрост, па сувязі з роднай культурай пераўзыходзяць некаторых дарослых. Мала хто ведае такія факты: на традыцыйным ручніку не павінна прысутнічаць болей за сем сімвалаў, а яго даўжыня пачынаецца ад 1,5 метра; калі гэта ручнік на ікону ці для хлеба, яго сярэдзіна пакідаецца невышыванай, белай і чыстай, а вось рукабітны ручнік (яго выкарыстоўваюць падчас вясельнай цырымоніі) мае арнамент па ўсёй даўжыні.

Адна з юных майстрых, Кацярына Эбергарт, распавяла, што калі б нацыянальная вышыўка з'явілася на сучасным адзенні, яна б з задавальненнем такое насіла. Гэта было б прыгожа, стыльна і з сэнсам. Кацярына і яе сяброўкі пакуль не вышываюць кашуль, але атрыманае ўменне дзецям у жыцці абавязкова спатрэбіцца. На сваё вяселле дзяўчатам дакладна не давядзецца набываць ручнікі. Некаторыя з удзельніц бізнес-кампаніі, дарэчы, ужо пачалі вышываць сабе «пасаг».

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

*Мінск — Дзяржынскі раён — Мінск.*

# «ВУЧОНЫ — ГЭТА І МАРКЕТОЛАГ, І МЕНЕДЖАР, І РЭКЛАМШЧЫК»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**— Каб атрымаць Прэзідэнцкую стыпендыю, гэтыя метады таксама спатрэбіліся?**

— Так, і з ёю, і з маім праектам для конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Першы праект быў фактычна заснаваны на кандыдацкай рабоце, у якой вывучаліся ўласцівасці бялкоў раслін сямейства складанакветных. Там былі пэўныя прыкладныя вынікі, але праца была збольшага фундаментальнай. А вось другое даследаванне, для «100 ідэй…», было ўжо скіравана менавіта на практыку. Там ішла размова пра выкарыстанне сумніка канадскага, які сёння ў некаторых краінах становіцца прычынай сапраўднай экалагічнай катастрофы. У Беларусі з ім змагаюцца, але плошчы, якія ён займае, павялічваюцца ў геаметрычнай прагрэсіі. Шкодна гэта таму, што там, дзе расце сумнік, не расце больш амаль нічога. На барацьбу з ім выдаткоўваюцца вялікія сродкі, і мой праект заключаўся ў іх кампенсацыі ці хаця б мінімізацыі. Справа ў тым, што ў корані сумніка змяшчаецца бялок, здольны знішчаць некаторыя фітапатагены (грыбы, якія шкодзяць раслінам). Гэты бялок можна выдзеліць і стварыць прэпарат, які можа быць выкарыстаны ў сельскай гаспадарцы. Такім чынам, знішчэнне сумніка будзе даваць пэўны фінансавы прыбытак. Папярэдняя дамоўленасць аб рэалізацыі праекта ў паўпрамысловых маштабах ужо існуе.

**— Вы згадалі пра фундаментальную навуку. З боку кіраўніцтва дзяржавы часта гучыць: беларуская навука павінна мець прыкладны характар, які прыводзіць да яе самаакупнасці. Ці згодны вы з гэтым?**

— Я думаю так: калі шукаць нейкае выйсце, то рабіць гэта вельмі акуратна. Тут можна знайсці залатую сярэдзіну: па напрамках, у якіх мы безнадзейна адсталі ад сусветнай навукі, фундаментальныя даследаванні сапраўды можна спыніць. Перавесці гэтыя падраздзяленні на прыкладныя «рэйкі» і чакаць ад іх пэўнай эканамічнай аддачы. Астатнія напрамкі, у якіх яшчэ не ўсё страчана, трэба працягваць падтрымліваць. Бо не вельмі хочацца, каб праз колькі гадоў мы пазычалі ідэі, напрыклад, у кітайскіх навукоўцаў.

**— Навукоўцам зараз даводзіцца працаваць у даволі складаных умовах. Такая з'ява, як «уцечка мазгоў», для Беларусі характэрная?**

